10-годдзе А. Лукашэнкі ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

НАДЗЕЯ ДУДЗІК ☞ 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 29 (2514) Год XLIX | Беласток, 18 ліпеня 2004 г. | Цана 2,00 зл.

Агулам ваяводскі самаўрад са „сваім урадам" дасягнуў ледзь 15,5% таго, чаго чакалі самаўрады і арганізацыі ўсяго ваяводства...

Фота www.bielsk-podlaski.pl

На падтрымку можа разлічваць староства ў Бельску-Падляшскім

Місія на паперы?

Падляшскае ваяводства — рэгіёнам актыўнага і зраўнаважанага развою, з выкарыстаннем натуральнага асяроддзя, шматкультурнай традыцыі і прыгранічнага распалажэння, — гэтак самаўрадавыя ўлады акрэслілі місію, якая мае спадарожнічаць стратэгіі развіцця рэгіёна.

Не перакладваецца гэта, аднак, на грошы, якія можа здабыць ваяводскі самаўрад і якія перададзены паветам паўднёва-ўсходняй часткі рэгіёна ў рамках кантракта ваяводства з урадам на бягучы год. Акрэслівае ён абсяг падтрымкі рэгіёна дзяржавай, значыць, назначэнне грошай акрэсленых м.інш. у ваяводскай праграме да 2006 года. Мясцовыя самаўрады, публічныя ўстановы, якія дзейнічаюць не дзеля прыбытку ды няўрадавыя і грамадскія арганізацыі маглі падаваць заявы, якія датычылі „разбудовы і мадэрнізацыі тэхнічнай і грамадскай інфраструктуры". Агулам да падзелу быў блізка 31 мільён злотых. Тэрмін падавання заяў мінуў 14 траўня. Былі пададзены 385 заяў на блізка 200 млн. злотых.

Маршалкоўская управа выбрала 66 заяў. Прымаліся пад увагу: згоднасць заяў з прыярытэтамі стратэгіі і ваяводскімі праграмамі, рэальнасць супольнага фінансавання, камплектнасць тэхнічнай і фінансавай дакументацыі і г.д. 22 чэрвеня ўправа ваяводства зацвердзіла выбраныя заданні да рэалізацыі. Мае іх яшчэ зацвердзіць Міністэрства эканомікі.

Найбольш сур'ёзную групу праектаў складаюць тыя, што датычаць дарожнага будаўніцтва, аховы здароўя, асветы і культуры. З 66 заяў толькі **сем** датычаць найбольш неінвеставанай паўднёва-ўсходняй часткі рэгіёна. На падтрымку можа разлічваць староства ў Бельску-Падляшскім — на перабудову дарогі ў мясцовасці Якубоўскае. Сёлета на гэтую мэту назначана 400 тыс. зл., з чаго 300 тыс. зл. дасць урадавы бок. 800 тыс. зл. (430 тыс. зл. — урад) мае пайсці на перабудову адрэзка вул. Беластоцкай і скрыжавання вуліц Спартыўнай з Баторыя і а. Дзевятоўскага ў Гайнаўцы ў частцы ваяводскай дарогі Гайнаўка — Кляшчэлі. На завяршэнне ўсяе задачы трэба яшчэ больш за 200 тыс. злотых. Да таго з кантрактных грошай мае быць перабудавана ваяводская дарога на адрэзку Елянка — Кляшчэлі (300 тыс. зл., у тым ліку 190 тыс. зл. — ад урада). Прадбачана таксама 1,6 млн. зл. (1,1 млн. зл. — ад урада) з каля 4 млн. зл. патрэбных на разбудову Комплексу школ у Сямятычах, а таксама больш за 101 тыс. зл. (81,5 тыс. зл. — ад урада) на рамонт фасаду музея ў Бельску-Падляшскім. У сваю чаргу ўсё недаінвеставаны Музей ікон у Супраслі (але гэта мае атрымаць цэнтральны абшар ваяводства) будзе мець усю патрэбную суму — 1 млн. 10 тыс. зл. (з чаго аж мільён дае ўрад). Урэшце, поўнасцю задаволены могуць быць жыхары Бельска, якія разлічваюць на каля 1,1 млн. зл. на мадэрнізацыю Ратушовага пляца і малога базару па вул. Крынічнай. І гэта ўсё, на што могуць разлічваць паўднёва-ўсходнія падляшы ў рамках кантракта. Агулам ваяводскі самаўрад са „сваім урадам" дасягнуў ледзь 15,5% таго, чаго чакалі самаўрады і арганізацыі ўсяго ваяводства, калі не ўлічваць, напрыклад, урадавых датацый да чыгункі (12 млн. зл.).

Вядома, некаторыя заданні, якія будуць рэалізаваны ў рамках кантракта, датычыць будуць таксама жыхароў Бельскага, Гайнаўскага ці Сямятыцкага паветаў. Справа перш за ўсё ў заявах наконт аховы здароўя, галоўным чынам на закупку мадэрнага абсталявання для бальніц. Аднак, на гэтыя грошы могуць разлічваць асяродкі аховы здароўя перш за ўсё ў Беластоку, і далей у чарзе планаваных закупак абсталявання — у Харошчы, Сувалках ды Ломжы.

А што скажуць на гэта непасрэдна зацікаўленыя прадстаўнікі самаўрадаў, як гэта акрэслена ў стратэгіі развою ваяводства — „паўднёва-ўсходняга абшару"? Стараста Гайнаўскага павета Уладзімір Пятрочук думае падобна, як шмат хто з падаўшых заявы:

— Я не цалкам задаволены. Не быў адобраны ні адзін з нашых праектаў. Тлумачыліся недахопам сродкаў. Наша староства падало тры заявы, былі таксама заявы з гмін нашага павета. Маем запісаныя дзве інвестыцыі, якія маюць быць рэалізаваныя на нашай тэрыторыі, але былі яны пададзены Падляшскай управай дарог. Будзем, аднак, шукаць грошай на нашы праекты ў інтэграванай праграме рэгіянальнага развою і ў рамках еўрасаюзных структурных фондаў.

Дырэктар ведамства рэгіянальнага развою Цэзары Алдакоўскі лічыць, што адна са стратэгічных мэт Падляшскага рэгіёна — „развой міжнароднага і рэгіянальнага супрацоўніцтва, з выкарыстаннем памежнага распалажэння ваяводства". Знаючыць, як з гэтага можна зразумець, у значнай ступені Бельскага, Гайнаўскага ды Сямятыцкага паветаў. У будучыні надзея гэтай часткі ваяводства застаецца на хвалі грошай, якая мае наплысці з Еўрасаюза, але і з Нацыянальнага плана развою Польшчы 2007-2013. Тут можа здасца дзіўным для выкарыстання (атрымання грошай) факт узнікнення на польска-беларускай мяжы — еўрасаюзнай мяжы.

Віцэ-міністр эканомікі Крыстына Гурбель сказала „Ніве":

— Адпаведную праграму, звязаную з вынікамі гэтага факту, можна сфармуляваць у рамках Плана развою, але на 2007-2013 гг. Поле — адкрытае. Калі адпаведная праграма будзе апрацавана, ёсць шанцы яе прыняць. Трэба палічыць вынікі, акрэсліць, што ў сувязі з гэтым хочам рабіць, колькі гэта будзе каштаваць і якія атрымаем вынікі.

Калі справа ў грошах у рамках кантракта, рэалізаванага да 2006 г., новая працэдура падавання заяў і новыя перамовы з урадам (новым?) пачнуцца ў новым годзе — ад пачатку.

Мацей Халадоўскі

Першая дзесяцігодка ☞ 2

Яўген Міранові́ч

Лукашэнка здзівіў свет у 1995 г., калі аб'явіў рэферэндум у справе дзяржаўнай мовы і нацыянальных сімвалаў. Гісторыя не ведала такіх выпадкаў, каб найвышэйшы прадстаўнік улады выступаў за выцясненне мовы карэннага насельніцтва і ўвядзення ў публічны ўжытак мовы суседняга народа. Гісторыя таксама не знае выпадку, калі па ініцыятыве ўлады сімвалы свабоды замянілі сімваламі зняволення...

Амбіцыя ☞ 2

Міхась Андрасюк

Побач з музычнай, павышаюцца і разгортваюцца нам таксама іншыя прасторы — літаратурная і асветніцкая. Мой аптымізм грунтуецца на салідных фундаментах. Набіраюць колераў літаратурныя конкурсы. Праўда, аўтары наогул адны і тыя ж, але ў кожны чарговы конкурс ступаюць яны з новымі вершамі і апавяданнямі. Ад гэтых конкурсаў атрымоўваецца — мабыць ускосны, мабыць, і не прадбачаны арганізатарамі, усё-ткі станоўчы рэзультат...

Перашкодзілі дажджы ☞ 4

Аляксей Мароз

Сёлетнія сенакосы распачаліся ўдала. Ранейшыя дажджы спрычыніліся да добрага росту травы, а пазнейшае сонечнае надвор'е спрыяла хуткаму сушэнню сена. На Бельшчыне і Гайнаўшчыне ўбіранню корму жывёле перашкодзілі дажджы. У некаторых месцах сенакосы адтэрмінаваліся нават на некалькі тыдняў. Здаралася, што гаспадары ўручную выносілі з ніжэйшых сенажацей прамоклае сена...

Талерантнасць ☞ 5

Уладзімір Лапцэвіч

Знікненне ідэалогіі і сістэмы апартэіду ў Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы, рэальныя крокі па захаванню культур нацыянальных меншасцей на тэрыторыі Еўрапейскага Саюза, дзейнасць многіх рэлігійных дзеячаў па ўкараненню верацярплівасці ва ўласных канфесіях у дачыненні да іншых рэлігій дае добрыя плады. Быць талерантным сёння — гэта значыць адпавядаць правілам добрага тону сучаснага грамадства...

Купалле ў Белавежы ☞ 9

Міхась Хмялеўскі

Непадалёк амфітэатра, з якога паплылі беларускія песні, размясціліся кіёскі з ласункамі, харчамі і півам ды сувенірамі з саломы і драўніны. А ў лясочку на траве расселіся групкі людзей, якія частаваліся, сардэчна размаўлялі і спявалі. Усюды адчуваўся ўрачысты, святочны настрой. Перад 21-й гадзінай пры мясцовым Доме культуры сфармавалася калона з харавых калектываў, якая з вянкамі, музыкай і песняй „Купалінка"...

9 770546 196000

Бі-бі-сі. Беларуска-беластоцкі слоўнік

А — Амбіцыя

Амбіцыя — абвостранае самалюбства, ганарлівасць, фанабэрыстасць (Тлумачальны слоўнік беларускай мовы).

Літаральна — амбіцыя станоўчая рыса характару чалавека. Вызначае накірункі і мэты, бывае стымулам у ажыццяўленні іх, узводзіць чалавека на чарговыя, вышэйшыя ступені грамадскай драбіны. Прымушае яго быць лепшым, або і самым лепшым.

Ведаючы агульнае значэнне слова „амбіцыя", можна задумацца, ці існуе яе наш, беластоцка-беларускі варыянт, можна б таксама паставіць пытанне: якія мы людзі — амбітныя, ці ўсё нам „да лямпачкі".

Калі б разглядаць амбіцыю як стымул для быцця лепшым, тады адказ на пытанне атрымоўваецца безумоўна станоўчы — усё, да чаго дакранецца наша рука, павышае свой узровень. Вось — скажам — фестывалі беларускай песні. Мерапрыемства заходзіць у чарговае дзесяцігоддзе і, як згодна сцвярджаюць арганізатары, яго ўзровень бесперапынна павышаецца. Пашыраецца на чарговыя тысячы круг слухачоў, выканаўцы засвойваюць новы рэпертуар, а прытым з кожным годам чысцей і чысцей набіраюць верхняе „до" або „сол".

Можна тады спадзявацца, праз якую сотню год амбіцыя хораў, салістаў і арганізатараў узвядзе гэтае мерапрыемства на самыя высокія музычныя вяршыні — у маштабе еўрапейскім, а падляшска-беластоцкім напэўна. Адзіным прыпонам можа тут аказацца цалкавітае знікненне беларусаў на Беласточчыне.

Побач з музычнай, павышаюцца і разгортваюцца нам таксама іншыя прасторы — літаратурная і асветніцкая. Мой аптымізм грунтуецца на салідных фундаментах. Набіраюць колераў літаратурныя конкурсы. Праўда, аўтары наогул адны і тыя ж, але ў кожны чарговы конкурс ступаюць яны з новымі вершамі і апавяданнямі. Ад гэтых конкурсаў атрымоўваецца — мабыць ускосны, мабыць, і не прадбачаны арганізатарамі, усё-ткі станоўчы рэзультат — пашырэнне традыцыі сумеснага чытання „Нівы" на сумеснае, сямейнае пісанне вершаў.

Абнадзейваюць на будучыню таксама алімпіяды беларускай мовы. Няма прычыны не верыць у згодную ацэнку арганізатараў, што ў параўнанні да леташняга выпуску, актуальны куды вышэйшы. Шырокае зацікаўленне гэтымі алімпіядамі — рэзультат — як сцвярджаюць удзельнікі — „кахання да беларускага языка", але, на маю думку, таксама і тут не апошняе значэнне мае амбіцыя і яе — няхай сабе і падсвядомы заклік — „быць лепшым".

Амбіцыя, што падбадзёрвае чалавека апярэджваць іншых, не чужая нашым палітыкам. У час абсалютнага падзення палітычных аўтарытэтаў, якраз беластоцка-беларускія прадстаўнікі гэтай сферы грамадскага жыцця зіхацяць яркімі зоркамі. Агіднае ім кумаўство, а папулярны зараз прынцып „давай толькі свайм", абыходзяць шырокім колам. З-за гэтай прычыны Маршалкоўская (здагадвайся — амаль беларуская) ваяводская ўправа ні залатоўкай не падтрымала які-колечы цягнік, што соннымі рэйкамі амаль беларускай Гайнаўшчыны прычаляе да канчатковага паўстанка.

Амбіцыя, што падбадзёрвае чалавека апярэджваць іншых, не чужая нашым палітыкам. У час абсалютнага падзення палітычных аўтарытэтаў, якраз беластоцка-беларускія прадстаўнікі гэтай сферы грамадскага жыцця зіхацяць яркімі зоркамі...

На соннай, амаль беларускай Гайнаўшчыне — самыя лепшыя ў краіне дзяржаўныя службы. Прыкладова — дарожная паліцыя. Аднак у гэтым выпадку мае веды грунтуюцца на даступных у масмедыях статыстыках і рэйтынгах.

Заступацца за амбітную руплівасць нашых хлопцаў, здаецца, больш кампетэнтныя іх бацькі-дзядзькі — трактарысты, у мітуслівы час жніўнай кампаніі абдораныя квітанцыяй з-за нястачы правага пражэктара або левага люстэрка.

Амбіцыі, асабліва нашай беластоцка-беларускай, не сцярпець ніякую крытыку. За такім меркаваннем муром стаіць скрыгатанне вашых зубоў, калі чытаеце гэтыя словы.

Скрыгат вашых зубоў — не скажу — напаўняе мяне смуткам. Але куды больш хвалюе мяне Оскар Уайльд. На яго думку — „Амбіцыя — апошняя прыстань банкрута".

Міхась Андрасюк

Першая дзесяцігодка

Дзесяць гадоў таму першым прэзідэнтам незалежнай Беларусі стаў Аляксандр Лукашэнка. У 1994 г. большасць жыхароў Еўропы не ведала, дзе знаходзіцца Беларусь. Неўзабаве, дзякуючы прэзідэнту, краіна праславілася на ўвесь свет. Сёння Лукашэнкам займаюцца палітолагі, псіхолагі, сацыёлагі ад Японіі да Канады. Усе шукаюць адказу як гэта сталася, што дзесяцімільённая краіна апынулася ў руках палітыка, які ў прэзідэнцкім крэсле паводзіць сябе так як раней на пасадзе калгаснага начальніка.

Лукашэнка здзівіў свет у 1995 г., калі аб'явіў рэферэндум у справе дзяржаўнай мовы і нацыянальных сімвалаў. Гісторыя не ведала такіх выпадкаў, каб найвышэйшы прадстаўнік улады выступаў за выцясненне мовы карэннага насельніцтва і ўвядзення ў публічны ўжытак мовы суседняга народа. Гісторыя таксама не знае выпадку, калі па ініцыятыве ўлады сімвалы свабоды замянілі сімваламі зняволення.

Два гады спатрэбілася сярэдне інтэлігентнаму афіцэру КДБ Аляксандру Лукашэнку, каб пабудаваць сістэму ўлады, дзе не было фактычна месца для палітычнай канкурэнцыі. Людзі з блізкага атачэння прэзідэнта, якія захацелі весці апазіцыйную дзейнасць, таямніча загінулі. Дэмакратычная апазіцыя імкнулася стварыць канкурэнцыю легітымнымі метадамі, аднак прэзідэнцкі апарат так хутка мяняў заканадаўства, што фактычна само існаванне апазіцыі стала злачынствам.

У выніку другога рэферэндуму 1996 г. Лукашэнка атрымаў уладу, якая дазваляе яму распускаць парламент. Поўны кантроль за публічным жыццём дазволіў прэзідэнту атрымаць пажаданы вынік на чарговых выбарах. Манаполія на сродкі масавай інфармацыі дала магчымасць прадставіць кожнае галасаванне як вялікую перамогу прэзідэнта.

У Беларусі ў апошніх дзесяці гадах узнікла асаблівая сістэма ўлады, падабенства якой дарма шукаць у Еўропе. Нават Слабадан Мілошавіч не меў у Сербіі такой манаполіі ў палітычным і гаспадарчым жыцці краіны як Лукашэнка ў Беларусі. У Сербіі была апазіцыя, якая выводзіла на вуліцы сотні тысяч людзей. Прэзідэнт Украіны Леанід Кучма — таксама супярэчлівы палітык, якога цяжка назваць прыхільнікам дэмакратыі. Аднак, на Украіне дзейнічае апазіцыя і прысутная яна таксама ў парламенце і сродках масавай інфармацыі. Найважнейшае, што Кучма не прынізіў свайго народа, не адабраў у яго мовы ды атрыбутаў незалежнасці і свабоды.

Сістэма ўлады ў Беларусі пад панаваннем Лукашэнкі найбольш напамінае краіны Сярэдняй Азіі — Узбекістан, Туркменістан, Казахстан ці Кіргізстан. Аднак там заўсёды была цалкам іншая палітычная традыцыя і структура грамадства. Можна падазраваць, што для Лукашэнкі натхненнем быў Кітай, дзе ва ўмовах таталітарнага камуністычнага рэжыму хутка развівалася гаспадарка. Справа ў тым, што ў Кітаі эліты ўлады выходзяць з радоў партыі, дзе пра месца паасобных людзей вырашае калектыў. У Беларусі, дзе гаспадарка развіваецца, як на еўрапейскія ўмовы, таксама даволі хутка, няма такой партыі. Усе рашэнні поўнасцю апынуліся ў руках аднаго чалавека.

Улада Лукашэнкі трымаецца не толькі на сіле міліцыі, адміністрацыі і кантролю за сродкамі масавай інфармацыі. Ад пачатку свайго панавання меў ён шмат прыхільнікаў. Несумненна выйграў ён першыя прэзідэнцкія выбары ў 1994 г. Пра сапраўдныя вынікі апошніх вядома няшмат. Аднак прабываючы ў Беларусі адчуваецца, што мае ён і цяпер падтрымку вялікай часткі беларускага грамадства, асабліва пакалення ў пенсійным узросце.

Кожная дыктатура пакідае ў грамадстве адмоўныя рысы. Такая сістэма ўлады не канчаецца разам з адыходам дыктатара. Нават тыя, якія змагаліся з таталітарнымі рэжымамі, будучы пасля пры ўладзе, часта імкнуліся пакарыстацца іх спрошчанымі метадамі кіравання. Лукашызм, як форма ўлады, не знікне ў Беларусі пасля адыходу Лукашэнкі. Не прападзе тым больш, што Лукашэнка на пенсію не збіраецца, а ніхто і нідзе яго ў свеце не чакае. Не можа ён пакінуць улады і таму, бо ведае, што кожная наступная — дэмакратычна выбраная — можа рашуча адмоўна ацаніць усю яго палітычную актыўнасць. Ведае ён таксама, што паслядоўнасці такой ацэнкі могуць быць вельмі прыкрыя.

Яўген Міранові ч

Вачыма еўрапейца

Пан В. у ЕС

Мой сусед, які жыве паверхам ніжэй, пан В., збірае па сметніцах банкі, макулатуру, жалезіва і што там яшчэ трапіцца, але што можна пералічыць як „дадатак" да ягонай пенсіі. Пачынаецца пасля трэцяй гадзіны, каб да чацвёртай абысці ўсе навакольныя сметніцы і газоны пад блёкамі. Тады банак з-пад піва найбольш. Пасёлкавыя малалеткі („блёкерсы") гучна балююць да позняй ночы. Гэта яны — будзільнік пану В. Адпаведную пару вызначаюць іхныя дзікія выкрыкі пад акном і зоў адных аднымі, быццам Тарзан клікаў караля Ільва. Асабліва тая пара важная ў суботы і нядзелі. Тыя, што штодзень працуюць, таксама і „піўкуюць". Тады трэба спяшацца, каб канкурэнцыя не паспела.

Пан В. ніколі не скрываў свайго скепсіс наконт уваходу Польшчы ў Еўрасаюз. Не думаў ён аб выкупліванні зямлі чужаземцамі ці накіданні ліберальных каштоўнасцей.

— А наколькі больш трэба мне будзе сабраць банак ці газет, каб дажыць да першага? — калькуляваў перад 1 маем.

Калі я спаткаў яго апошні раз (на пачатку ліпеня), пералічваў:

— Мяса — падаражэла, хлеб падаражэў. Маслечка задарагое. Цукар ужо раней, і так засталося, дарэчы, цукру ўжо не ўжываю. Добра, што хоць цяпер канікулы. Больш моладзі банкі пакідае, але і газет меней.

Расказвае, што ў гэтым ЕС жывецца бядней, але бачыў у тэліку, што трэба вучыцца ад немцаў. Бачыў, як банкі кідаюць яны да банак, паперу да паперы, шкло да шкла. Ужо дома гэтак робяць.

— Калі б так і ў нас было, дык на маслечка я сабе дазволіў бы штодзень. Вось, прычаіўся б, калі трэба, і хапіла б толькі павыбіраць тое з кантэйнера, а не грэбціся ў смецці, каб знайсці пару баначак. Але ёсць так, як ёсць, што зробіш. Прынамсі дзятва дае мне зарабіць. Што? Спяваюцца? А што маюць яны рабіць? Бацькі не бачаць, не ведаюць. То ж гэта ўсё пад іхнымі вокнамі.

Дзень да напісання гэтых „Вачэй" я наткнуўся на пана В., які глядзеў непрысутным зрокам.

— Што з вамі? — спытаўся я.

— Ах, — уздыхнуў і прысеў на лавачцы пад нашым пад'ездам. — Рак мяне дапаў. Ужо ёсць метастазы па ўсім целе. А ў шпіталі — чэргі.

Як, мабыць, большасць з нас, я не ведаў, што яму сказаць. Як дурному прыляцела мне ў галаву тое, што пачуў у тэлебачанні:

— Ну, ведаеце, цяпер, вядома, хутчэй і лепш можна лячыцца і за мяжой...

— Ага, ага, — паківаў галавой пан В. — Ведаю. Але адкуль жа мне ўзяць грошы на падарожжа і на іншае?.. Гэтае еўрасаюзнае лячэнне не для такіх баначнікаў, як я. Доктар, дарэчы, шчыра сказаў, што застаўся мне нейкі год.

Зноўку ўздыхнуў. Развітаўся і паехаў каляскай да наступнай сметніцы. Я застаўся на лаўцы. Прыгадалася мне песенька даўно не чутай спявачкі: „Miał być cud, miał być miód. Ersatz, cholera, nie życie".

Пасля ўваходу ў Еўрасаюз штосьці там мела падаражэць, але і штосьці патаннець. Цана ялавічыны, было вядома, мае падскочыць, але кураціна мела быць таннейшай. За ласункі мелі мы плаціць больш, але за муку і хлеб — меней. Фактычна яшчэ да 1 мая ўсё пачало даражэць. Пасля цэны ўсё раслі, і растуць. Пакуль што, нічога не паказвае, каб мела штосьці змяніцца. Ніхто над гэтым не пануе. Кажуць, свабодны рынак. За гэтыя амаль 2 месяцы аказваецца, што найслабейшыя могуць разлічваць адно толькі на Божую волю, бо адміністрацыйная воля, польска-брусельская, — яшчэ больш бязлітасная. Пакуль што, можам зларадна суцяшацца, што ў такой еўрасаюзнай Нямеччыне таксама не будзе лепш. Ад 1 студзеня наступнага года маюць быць там рэзка паніжаны ўспамогі беспрацоўным, а той, што нахабна будзе ўхіляцца ад прапаноў любой працы, будзе пазбаўлены дапамогі. Ды што гэта за суцеха пану В., якому фактычна мала ўжо ўсяго засталося. Ці зможа ён у Польшчы задзіночанай Еўропы дажыць як чалавек, штораз слабейшы, калі нават банкамі з-пад піва не зможа ратавацца...

Мацей Халадоўскі

Уладзімір Колас: Лукашэнка за дзесяць год кіравання так і не ўсвядоміў сябе беларусам. Ён нарабіў шмат шкоды для беларускасці. Нават у часы Савецкага Саюза мы мелі намнога больш беларускамоўных школ...

Без права на выпраўленне

...і ў вечны бой ісці гатоў

Дзесяць год таму, у ліпені 1994 года, беларускі народ абраў першага ў сваёй гісторыі прэзідэнта краіны. Упэўнена перамогшы ў другім туры Вячаслава Кебіча, гэтую пасаду заняў Аляксандр Лукашэнка. Яго перадвыбарныя абяцанні практычна нічым не адрозніваліся ад дэмагогіі Кебіча — аднавіць разбураныя эканамічныя сувязі, увесці расійскі рубель, інтэгравацца з Расіяй... Здаецца вельмі парадаксальным, што ў той час, калі беларускі народ абраў шлях да незалежнасці, мог на перамогу разлічваць кандыдат з такой праграмай, бо нават камуністычная парламенцкая большасць пад націскам апазіцыі БНФ і вулічных акцый беларускага грамадства, якія на пачатку дзевяностых сама масавымі былі менавіта ў Мінску, змушана была абвясціць незалежнасць Беларусі, прыняць старадаўнюю беларускую сімволіку і надаць беларускай мове статус дзяржаўнай. Такі ход падзей сведчыў, што ўзяўшы папулісцкія абяцанні аднаўлення Савецкага Саюза, наўрад ці можна было разлічваць на пераважную большасць галасоў выбаршчыкаў. Каму ж тады на людзях і з экранаў тэлевізараў даваў свае прысягі Аляксандр Рыгоравіч? На каго яны былі разлічаны?

Дзесяць год кіравання Лукашэнкі самі даюць адказ на пытанне. Беларускае грамадства дзевяностых зусім не ўспрымала аніякіх абяцанняў. Сем дзесяткаў гадоў панавання савецкага ілжывыга рэжыму адвучылі людзей верыць у абяцанні. Беларусы ў сваім выбары кіраваліся эмоцыямі. Іх папросту прывабілі думкай, што Лукашэнка — свой хлопец з народу, просты, такі як усе. І робіць усё ён дзеля людзей. Сам жа будучы прэзідэнт і яго актыўнае атачэнне добра разумелі, што вынік выбараў залежаў не толькі ад выбаршчыкаў. Дзве магутныя сілы, беларуская наменклатура і расійскія спецслужбы пільна сачылі за тым, каб захаваць свае ўплывы ў беларускім кіраўніцтве. Менавіта ў іх адрас гучалі публічныя заявы кандыдата ў прэзідэнты, што дзеля выканання сваіх абяцанняў ён не толькі на каленях можа папаўзці ў Маскву, але і гатовы ісці ў бой.

Постсавецкая наменклатура на той момант ужо ачуняла ад нядаўніх паразаў, усё яшчэ заставалася пры ўладзе і не збіралася яе губляць. Ёй быў патрэбны чалавек, які не дазволіць правесці прыватызацыю, дэмакратызацыю, і як вынік, будзе гарантам таго, што яна застанецца і пры ўладзе, і пры маёмасці. Расія, як і заўсёды, кіравалася сваімі імперскімі амбіцыямі і эканамічнымі выгадамі. Лукашэнка задавальняў і тых, і другіх. Заставалася толькі паспрыяць прыходу Аляксандра Рыгоравіча да ўлады, а пасля пазбавіць яго мажлівасці праводзіць не такую палітыку, якую ён дэкларава. Стварыць такія варункі, каб прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, нават пры жаданні штосьці змяніць, не мог нічога зрабіць. Пазбавіць яго мажлівасці на выпраўленне дзяржаўнага курсу.

А. Лукашэнка і мітрапаліт Філарэт

...разбурым, аж да падмуркаў, а пасля...

Але прыход Лукашэнкі да ўлады не азначаў поўнай перамогі постсавецкай бюракратыі і расійскіх імперскіх амбіцый. Гэтаму заміналі два фактары — апазіцыя на чале з парламенцкай фракцыяй БНФ і нацыянальная самасвядомасць беларускага народа, якая тады расла ў геаметрычнай прагрэсіі. І новы начальнік дзяржавы пачаў актыўна выконваць сваю галоўную місію — змагацца і з тым, і з другім. Пачалася эпоха збівання дэпутатаў, разгону вулічных акцый, арыштаў, прысудаў, палітычнай і эканамічнай эміграцыі, занядбання нацыянальных каштоўнасцей... З апазіцыяй змагацца было не так цяжка, маючы падтрымку Расіі (прыкладам прыезд у Мінск Чарнамырдзіна, які перашкодзіў аб'явіць Лукашэнку імпічмент) і поўную прыхільнасць постсавецкай наменклатуры, якая цалкам кантралявала вынікі выбарчых працэсаў і рэферэндумаў. А вось з прагай беларускага народа да адраджэння сваіх нацыянальных каштоўнасцей, незалежнай дзяржавы змагацца практычна немажліва. Заставаўся адзін шлях — разбураць гэтыя каштоўнасці.

Заменай дзяржаўнай сімволікі і наданнем рускай мове такога ж статусу як і беларускай Лукашэнка канчаткова паказаў, якія плыні стаяць за ім, і кім ён ёсць. „Гэты чалавек за ўсе гады так і не ўсвядоміў сябе беларусам, — дзеліцца сваімі думкамі з карэспандэнтам «Нівы» старшыня грамадскай ініцыятывы «Рада беларускай інтэлігенцыі», дырэктар зачыненага ўладамі беларускага гуманітарнага ліцэя **Уладзімір Колас**. — Лукашэнка за дзесяць год кіравання так і не ўсвядоміў сябе беларусам. Ён нарабіў шмат шкоды для беларускасці. Нават у часы Савецкага Саюза мы мелі намнога больш беларускамоўных школ, куды больш выдавалася беларускамоўных падручнікаў і іншых кніжак на роднай мове. Ідзе мэтная спроба разбурэння беларускай нацыянальнай свядомасці, каб стварыць іншую ідэалогію. Але я ўпэўнены, што беларускі народ вытрымае і гэты цяжкі перыяд і знойдзе свой шлях развіцця".

Дажынкі 2001

...мы наш, мы новы свет збудуем...

Здаецца, што Аляксандр Рыгоравіч і сам слаба арыентуецца ў тым, што ён будуе. Лозунг „Назад у СССР" загінуў разам з перспектывамі ўзначаліць новае падабенства былога сацыялістычнага монстра. Інтэграцыя з Расіяй патроху, як стала зразумелым што Пуцін не дазволіць кіраваць па-чарзе, таксама закульгала. Пакуль што, усе спробы зрабіць у Беларусі нешта іншае, чым беларускую краіну, не прыжыліся. Апошнім часам дамінуе штучная ідэя пабудовы сацыяльнай краіны з жорсткай цэнтралізаванай уладай і моцнай прэзідэнцкай вертыкаллю. „Гэты чалавек робіць усё, каб застацца пры ўладзе, — дзеліцца сваімі развагамі з чытачамі «Нівы» вядомы беларускі пісьменнік і грамадскі дзеяч **Сяргей Законнікаў**. — За дзесяць год кіравання ён сам не ведае куды прывёў краіну. І зараз у яго толькі адна задача — не згубіць уладу, утрымліваць яе ўсімі сродкамі. Адсюль, не зважаючы на і так кволы бюджэт, утварыліся новыя пасады «зампалітаў» на вытворчасці, адсюль і ўтварэнне ды падтрымка неакамсамольскіх арганізацый, адсюль і новыя піянеры... Кіраўніцтва краіны засталося без нейкай лагічнай трывалай ідэалогіі. Усе сілы скіраваныя на знішчэнне апазіцыі і на пустую дэмагогію. Толькі пра адно маўчыць прэзідэнт. Пра свае ранейшыя абяцанні знішчыць карупцыю. На гэтых абяцанках ён, па сутнасці, і прыйшоў да ўлады. Дастаткова проста паглядзець адкуль узяўся прэзідэнцкі фонд, каб зразумець як выканаў свае антыкарупцыйныя дэкларацыі Лукашэнка. Цяпер такое ўражанне, што ён нічым больш не заклапочаны, акрамя як сваім лёсам. І дзеля далейшага ўтрымання ўлады пойдзе на ўсё. І на чарговую змену Канстытуцыі таксама".

Сапраўды, Лукашэнка не зрабіў аніводнай заявы, што не будзе мяняць Канстытуцыю, на прыняцці якой сам жа настойваў. Ды і ход падзей ускосна пацвярджае яго намер застацца пры ўладзе. Зноў прагучалі заявы пра саюзную дзяржаву. Зразумела, што яны адрасаваны найперш Крамлю. Зноў сцвярджаецца пра неабходнасць захаваць цяперашнюю палітычную і эканамічную стабільнасць краіны. Зразумела, што гэтыя заявы для класа постсавецкай наменклатуры, які будзе кантраляваць ход выбарчага працэсу. Усё як і дзесяць год таму. Толькі ахвяр пабольшала.

Аналізуючы час Лукашэнкі пры ўладзе, становіцца зразумелым, што сам ён не прасунуўся ў развязанні сваіх пытанняў ні на трохі. І таму мусіць рабіць тое, з чаго пачынаў у 1994 годзе. Беларускае грамадства не толькі саспела да палітычных і эканамічных змен, але і патрабуе іх. А Лукашэнка па-ранейшаму абапіраецца на сілы, якія не даюць яму права на змены і выпраўленне сітуацыі ў Беларусі.

Віктар Сазонаў

Бельскі шпіталь

Рада павета ў Бельску-Падляшскім у маі г.г. адобрыла фінансавую справаздачу мясцовага шпіталя за 2003 год. Фінансавы рэвізор Аліцыя Бянькоўская ацэньвае, што нягледзячы на беззаганнасць справаздачы шпіталь апынуўся ў цяжкіх абставінах, бо да пагашэння астаюцца ранейшыя задоўжанасці вартасцю больш за шэсць мільёнаў злотаў. У мінулым годзе шпіталь дабіўся прыходу вартасцю ў звыш шаснаццаць тысяч злотаў, з-за чаго можна меркаваць, што задоўжанасць не пабольшае. Аднак жа без фінансавай дапамогі звонку і рашучай змены ў галіне кантрактавання медыцынскіх паслуг да кампенсуючага расходы ўзроўню далейшая дзейнасць шпіталя можа неўзабаве апынуцца пад пагрозай.

Прыведзеную ацэнку падзяляе і праўленне павета. Залежнасць шпітальнага бюджэту ад Нацыянальнага фонду здароўя і скарачэнне вартасці кантрактаў на медыцынскія паслугі ў 2004 годзе могуць паралізаваць тэрміновае рэгуліраванне плацяжоў, бо ж у гэтым годзе трэба яшчэ распачаць сплату мінулагодняга крэдыту. Аднак, як заявіла дырэктар Бажэна Гратовіч, шпіталь не збіраецца абмяжоўваць дыяпазону медыцынскіх паслуг, якіх цэны меншыя за кошты. З мэтай выхаду з крытычнай сітуацыі дырэкцыя запрапанавала працаўнікам змену працоўных дамоў. Працаўнікі і прафсаюзы згадзіліся на змену заробкаў, што ў вялікай ступені і паспрыяла паправе фінансаў шпіталя за мінулы год. Не ўлічана звыш мільёна сямісот пяцідзесяці тысяч злотаў у парадку закону „203", а таксама закінута спісванне ў карысць фонду сацыяльнай падмогі вартасцю звыш трохсот дваццаці тысяч злотаў.

Недастатковае фінансаванне з НФЗ ставіць пад пагрозу рэгуліраванне плацяжоў, а ўслед за гэтым і абцяжарванне адсоткамі ды ў некаторых выпадках секвестрацыйнымі спагнаннямі. Фінансавае бяссілле не можа стаць прычынай спынення дзейнасці шпіталя, якая накіравана на яго прынцыповыя мэты і задачы. У Бельскім павеце няма іншых суб'ектаў, якія ў змозе несці няспынную медыцынскую дапамогу насельніцтву.

Міхал Мінцэвіч

Прытулак

На тэрыторыі Бельскага павета працуе толькі адзін дом сацыяльнай дапамогі — у Браньску, у які скіроўваюцца бездапаможныя асобы з працяглымі цялеснымі недамогамі, якія патрабуюць кругласутачнай апекі. Дзякуючы міжпавятоваму супрацоўніцтву хворых з Бельскага павета могуць прымаць прытулкі ў іншых паветах. І так, у 2003 годзе з Бельшчыны 25 асоб скіравалі ў Дом сацыяльнай дапамогі ў Браньску, 2 асобы ў Чараўкі (Беластоцкі павет) і 3 у Белавежу (Гайнаўскі павет). Кошт пабыўкі ў прытулку асоб, кіраваных гмінамі і староствамі, не можа перавышаць 70% іх прыходаў, а ў выпадку малалетніх — 70% прыходаў іх законных прадстаўнікоў. **(мм)**

Перашкодзілі дажджы

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Ян і Марыя Супэлы сушаць сена традыцыйна

Сёлетнія сенакосы распачаліся ўдала. Ранейшыя дажджы спрычыніліся да добрага росту травы, а пазнейшае сонечнае надвор'е спрыяла хуткаму сушэнню сена. На Бельшчыне і Гайнаўшчыне ўбіранню корму жывёле перашкодзілі дажджы. У некаторых месцах сенакосы адтэрмінаваліся нават на некалькі тыдняў. Здаралася, што гаспадары ўручную выносілі з ніжэйшых сенажацей прамоклае сена і перасушвалі яго на распаложаных вышэй лугах. Трэба было адставіць на бок трактарныя варочалкі і прычэпы, што самі збіраюць сена і карыстацца здаўна выпрабаванымі граблямі і віламі.

Нават жыхары Збуча і Чыжоў, якія заўсёды рана выходзілі касіць траву-сеянку, не справіліся да першых дажджоў. Калі ў сонечнае надвор'е наведаў я гэтыя вёскі, іх жыхары з нецярплівасцю спазіралі на неба. Цёплае і духмянае паветра не давала пэўнасці, што сонечнае надвор'е ўтрымаецца да адвячорка. Каля Збуча пры дарозе ўбачыў я трактар з возам падрыхтаваным для звозкі сена.

— Вялікая трава вырасла, лепшая чым у мінулых гадах. Аднак надвор'е дрэннае, — кажа Ян Кубайчук. — Не буду ўжо дастасоўваць хлява да еўрасаюзных патрабаванняў, бо ў мяне адна карова. Трэба было б выдаткаваць на рамонты многа грошай, а я ж ужо пенсіянер. У Збучы гаспадароў пяць, якія разгарнулі сваю дзейнасць і будуць дастасоўвацца да еўрасаюзных законаў.

Другі гаспадар са Збуча Ян Супэла, які побач дарогі накладвае сена на воз, пацвярджае, што сёлетняя трава была вельмі прыгожай.

— Тыя, што раней пакасілі, прывезлі прыгожае сена. Пазнейшыя дажджы сапсавалі плён, — гаворыць гаспадар. — У мяне шэсць штук быдла, але яшчэ не прыстасоўваў хлява да новых патрабаванняў. Калі атрымаецца, хачу пайсці ў гэтым годзе на ранейшую структурную пенсію. У іншым выпадку са жніўня пачну рабіць даільны адсек і, покі дазволяць, буду гаспадарыць. У Збучы яшчэ многія гаспадары не перарабілі хлявоў.

У суседняй вёсцы Чыжы на вуліцы пуста. Некалькі асоб сядзіць на лавачках каля магазіна. У солтыса Андрэя Ціханюка адкрытыя вароты, а жонка Валянціна паведамляе, што муж паехаў на сустрэчу арганізаваную Гайнаўскім малочным кааператывам.

— Мы паспелі ўбраць большасць сена. Толькі дзве прычэпы трэба было дасушваць. Калі сонечнае надвор'е, мы сушым сена з выкарыстаннем машын. Спрасаваныя коўбачкі трымаем над аборай і туды трэба падаваць вілкамі. У дзесяць прычэпаў сабралі рассыпное сена і прывезлі пяць прычэпаў коўбачкаў. У гэтым годзе памагаць у сенакосах прыязджалі дзеці, — інфармуе Валянціна Ціханюк. — Апошнім часам хварэем з мужам і таму паменшалі колькасць дойных кароў з шаснаццаці да чатырох. Проста не ў сілах былі справіцца з гадоўляй так вялікай колькасці быдла.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Валянціна Ціханюк дастасавала абору да еўрасаюзных патрабаванняў

У Ціханюкоў ёсць дваццаць сотак трускалак і многа збожжа.

— Збожжа вырасла прыгожае, але плён будзе залежаць ад надвор'я ў будучыні. Можа ярына крыху п'яноватая, бо раней было холадна і сухавата. Трускалкі слабаватыя, бо ішлі дажджы і халаднавата было, а бульба пачала падмакаць, — тлумачыць гаспадыня.

Згаджаецца яна паказаць сваю абору, якую з мужам прыстасавалі да еўрасаюзных патрабаванняў.

— У нас ветэрынар за першым разам зацвердзіла дастасаванне аборы для даення кароў. Аднак дазвол, так як і ў іншых гаспадароў, толькі на год. Пасля трэба будзе ізноў звяртацца за згодай, — кажа мая суразмоўніца. — Зверху пабялілі абору, а знізу памалявалі алейнай фарбай. Яшчэ раней давялі мы ваду і зрабілі месца, якім будзе сцякаць гнаёўка. Каб правільна даіць, трэба падкладваць пад кароў гумовыя дыванікі. Даярка ёсць, але даю ўручную, бо не аплачваецца яе раскладаць і пасля мыць.

Зрух у Чыжах з перабудовай хлявоў распачаўся вясной. Гаспадары сталі выдзяляць у хлявах месца і прыстасоўваць яго на даярню. Малады гаспадар, што гадуе больш кароў, заводзіць мяне ў прыгожа памаляваную даярню. Бетонная падлога паніжаецца ў адным месцы і там умураваная клетка, у якую мае сплываць вада падчас абмывання каровы. Цяпер стаяць там дзіцячыя веласіпеды, бо кароў дояць на полі аддаленым на 2,5 кіламетра. Іншы гаспадар Уладзімір Башун пачаў мадэрнізаваць хлеў і яшчэ не закончыў інвестыцыі. У яго аборы каровы будуць стаяць на саломе і таму штодзень трэба будзе вывозіць гной. Выканаў ён з дроту падстаўкі пад вёдры, каб у час даення кароў не стаялі яны непасрэдна на саломе і не брудзіліся.

— Зараз паедзем вывозіць падмоклае сена, — заяўляе спяшаючыся на поле Уладзімір Башун. — Трактар з прычэпам пастаўлю на ўзгорку і віламі будзем выносіць сена. Пасля перасушым у іншым месцы. Яшчэ трэба касіць траву каля Кленік, а там таксама нізкая тэрыторыя.

Адным з буйнейшых гаспадароў у Чыжах з'яўляецца Аркадзь Астапчук. На панадворку спатыкаю ягонага бацьку Яна.

— За камуны я купіў трактар і машыны, а зараз думаю адкуль браць грошы на бягучыя выдаткі, — з наракання пачынае размову Ян Астапчук. — Уваходзячы ў Еўрасаюз мы ўскочылі як у балота. Каб нам нешта далі, спачатку мусяць забраць. Паслам і бізнесменам можа быць лепш, але простым людзям будзе горш.

У час абеду Ян Астапчук пачынае расказваць пра цяжкую працу на гаспадарцы і слабы ад яе прыбытак.

— Калі палічыць усю працу, якую трэба выканаць даглядаючы кароў, то прыбытковасць з іх гадоўлі ніякая, — гаворыць гаспадар. — Даход ад збожжа слабы, а пасля ўваходу ў Еўрасаюз цана на яго панізілася.

Гаспадыня паехала ў Гайнаўку прадаваць трускалкі. У спадарства Астапчукоў трускалак ажно паўгектара. У мінулым годзе быў ад іх вельмі вялікі прыбытак, бо многа за іх плацілі. Зараз купляюць па 1,8 злота за кілаграм і плён не надта высокі ў час халаднаватага лета.

— Трускалкі чэрві падтачылі, псуюцца пасля дажджу і слаба спеюць, — заяўляе спадар Ян.

У глыбі панадворка спадарства Астапчукоў красуецца вялізная абора. Невялікая драўляная хата абабітая сайдынгам здаецца быць маленькай у параўнанні з вялікім будынкам для жывёлы. Зараз, калі трэба будаваць даільныя адсекі, мала застаецца сродкаў, каб інвеставаць у жыллё для людзей.

Аляксей Мароз

Падарожжа ў Беларусь

Рада Таварыства беларускай культуры ў Літве, амаль у поўным складзе, здзейсніла запланаванае падарожжа па гістарычных мясцінах Беларусі.

Раніцай 26 чэрвеня мікрааўтобусам выехалі мы з Вільні і прыехалі ў Мінск, дзе нас ветліва сустрэлі ў сваёй сядзібе сябры ЗБС „Бацькаўшчына" на чале са старшынёю Рады Аленай Макоўскай. Нягледзячы на неспрыяльнае надвор'е, амаль увесь дзень марасіў дождж, настрой усіх быў вельмі добры. З дапамогай А. Галіча, выдатнага экскурсавода і краязнаўца, наведалі мы Маскоўскія могілкі, дзе ўсклалі кветкі на магілу Васіля Быкава. Уся магіла Васіля Быкава патанала ў жывых кветках і вянках, прынесеных народам свайму апосталу. Тут сустрэлі мы пісьменніка Уладзіміра Някляева і гасцей з Фінляндыі.

На Кальварыйскіх могілках ушанавалі мы памяць акадэміка Усевалада Ігнатоўскага ды іншых відных дзеячаў беларускага адраджэння.

Наступны маршрут быў у Курапаты, дзе мы пакланіліся бязвінным ахвярам бальшавіцкага варварства. Далей шлях ляжаў цераз Барысаў да Бобра — радзімы вядомага беларускага мастака Алеся Пушкіна, дзе пазнаёміліся з усёй яго раднёю. Сам Алесь у гэты час знаходзіўся на працы ў Міхалішках. Знайсці хату Пушкіна было няцяжка, бо на фасадзе дома лунаў бел-чырвона-белы сцяг. Мы ў захапленні аглядалі як мастацкія творы А. Пушкіна, так і кожны элемент інтэр'ера дома, што меў непаўторны пушкінскі акцэнт.

Добра адпачыўшы накіраваліся мы ў Оршу. Тут наведалі музей Уладзіміра Караткевіча, яго прыгожы помнік у гарадскім парку, дом дзе нарадзіўся пісьменнік і, канешне, сам горад. З Оршы рушылі ў Віцебск. Горад Віцебск мае сусветную славу, звязаную з імем Марка Шагала. Агледзелі мы музей М. Шагала, вельмі прыгожую скульптуру Уладзіміра Караткевіча ў гарадскім парку, шмат пахадзілі па горадзе.

Далей шлях ляжаў у Полацк. У Полацку сустрэліся мы і бліжэй пазнаёміліся з сям'ёй Алеся Аркуша. Яны міла апекаваліся намі і размясцілі ў сваім з вялікім густам адрэстаўрыраваным доме. Полацк вабіць сваёй гісторыяй, велічнымі царквой і касцёлам. У Спаса-Еўфрасіннеўскім кляштары прылажыліся мы да мошчаў св. Еўфрасінні Полацкай і выслухалі аповед пра жыццё асветніцы.

Далей шлях ляжаў у Паставы і Міхалішкі. У Міхалішках сустрэлі мы Алеся Пушкіна, які рэстаўруе іконы ў мясцовым касцёле.

Поўныя прыемных уражанняў і добрага настрою, пасля трох дзён падарожжа вярнуліся мы ў Вільню.

На жаль, не абышлося без лыжкі дзёгцю. Падводзячы вынікі нашага падарожжа па гарадах і вёсках Беларусі з болем у сэрцы адзначаем пра трагічны стан галоўнага элемента культуры, асновы нацыі — беларускай мовы, якой амаль нідзе мы не чулі.

Хведар Нюнька

Спатканне дзеля талерантнасці

Напрыканцы чэрвеня ў Варшаве пры пасрэдніцтве Хельсінскага Фонду правоў чалавека, Сакратарыята ўпаўнаважанага Урадам па справах роўнага статусу жанчын і мужчын, а таксама Міністэрства замежных спраў адбылося спатканне арганізацый і ўстаноў, якія займаюцца праблематыкай расізму, ксенафобіі і неталерантнасці.

Нягледзячы на даволі істотныя поспехі ў барацьбе з такімі праявамі нецярплівасці адных людзей да іншых, што мелі месца на нашай планеце ў другой палове мінулага стагоддзя, па ранейшаму існуюць нявырашаныя пытанні, асабліва на мясцовых узроўнях. Сапраўды, знікненне ідэалогіі і сістэмы апартэіду ў Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы, рэальныя крокі па захаванню культур нацыянальных меншасцей на тэрыторыі Еўрапейскага Саюза, дзейнасць многіх рэлігійных дзеячаў па ўкараненню верацярплівасці ва ўласных канфесіях у дачыненні да іншых рэлігій дае добрыя плады. Быць талерантным сёння — гэта значыць адпавядаць правілам добрага тону сучаснага грамадства. У той жа час праяўляць непрыязнасць да людзей іншай рэлігіі, нацыянальнасці ці, нават, сексуальнай арыентацыі, значыць засведчыць самога сябе як асобу нецярплівую да людзей з іншымі поглядамі і іншага паходжання. Тым больш, што апошняе не залежыць ні ад каго, акрамя Бога.

Вышэйадзначанае спатканне цягнулася два дні. Першы быў прысвечаны праблемам, з якімі сутыкаюцца ў паўсядзённым жыцці прадстаўнікі нацыянальных меншасцей. Удзельнікі мерапрыемства асаблівую ўвагу надавалі сітуацыям, у якіх аказваюцца цыганы. Гэты народ у адрозненні ад іншых нацыянальных меншасных груп не мае, так бы мовіць, зямлі абяцанай і ніводная з дзяржаў рэальна не ставіць за мэту захаванне і развіццё яго культуры і мовы. Традыцыйнае ж стаўленне да цыганоў на тэрыторыі Еўропы з большага негатыўнае, што, зразумела, адбіваецца і на спробах апошніх інтэгравацца ў грамадства той краіны, на тэрыторыю якой закінуў іх лёс. Адна з асноўных праблем цыганоў — адсутнасць працы. Людзей гэтай нацыянальнасці прымаюць на свабодную вакансію ў самую апошнюю чаргу, а часцяком працадаўцы аддаюць перавагу далейшаму працягу пошукаў работніка, а не затрудненню цыгана. Нягледзячы на тое, што змагацца з такімі праявамі нацыянальнай нецярплівасці цяжка, спосабы, як сведчылі прадстаўнікі міжнародных грамадскіх арганізацый, ёсць. І самае галоўнае, каб усе факты былі зафіксаваны, каб неабгрунтавана пакрыўджаныя прадстаўнікі нацыянальных меншасцей не заставаліся сам на сам са сваімі праблемамі, а звярталіся ў адпаведныя праваабарончыя арганізацыі, якія, па меншай меры, знойдуць магчымасць раскрыць і паказаць грамадству канкрэтнага прадпрымальніка-ксенафоба і расіста, свайго роду ваўка ў авечай шкуры. Не цяжка ўявіць, якой пасля таго будзе выглядаць дзелавая рэпутацыя такога бізнесмена.

Другі дзень спаткання быў прысвечаны прадстаўленню дзейнасці ААН і польскага ўрада ў барацьбе з расавай і этнічнай дыскрымінацыяй. Што тычыцца Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, то тут цяжка пераацаніць яе ролю ў вырашэнні данай праблемы. На сённяшні дзень можна нават казаць аб выніках такой дзейнасці, якія аказаліся не ўсім даспадобы, прыкладам чаго стала прызнанне злачынствам супраць афрыканскіх народаў дзейнасць краін Еўропы і Амерыкі, якія выкарыстоўвалі працу чорных нявольнікаў. Цяпер некаторыя афрыканскія дзяржавы патрабуюць грашовых кампенсацый.

Польшча таксама не стаіць у баку ў вырашэнні праблемы этнічнай дыскрымінацыі на сваёй тэрыторыі. Дзяржаўныя органы — суд і пракуратура, якія здабылі за апошнія 15 гадоў сапраўдную незалежнасць — з'яўляюцца асноўнымі вартавымі правоў людзей некаталіцкіх веравызнанняў і няпольскай нацыянальнасці. Таксама дзейнічаюць асобныя структуры ў парламенце і ўрадзе, якія займаюцца праваабарончай тэматыкай, уведзены інстытут омбудсмена (rzecznika praw obywatelskich). Хаця, зразумела, ёсць і шэраг доўгі час нявырашаных пытанняў, кшталту праблемы сілезцаў ці прыняцця закону аб нацыянальных меншасцях.

Напрыканцы мерапрыемства прадстаўнікі няўрадавых арганізацый папрактыкаваліся ў прымяненні здабытых ведаў на прадмет супрацоўніцтва са структурамі польскага ўрада і ААН дзеля рэалізацыі ўласных праграмных установак.

Уладзімір Лапцэвіч

Свярбелі рукі?

Аўтобусны прыпынак ПКС у Заблудаве пабудаваны з прыгожай чырвонай цэглы, ёсць там лавачкі для пасажыраў пад дашком ды жаночы і мужчынскі туалеты. Па другім баку вуліцы ёсць таксама лавачка пад дашком, а побач бетонны слуп, на якім была памешчана распіска курсіравання аўтобусаў у напрамку Бельска-Падляшскага, Гайнаўкі і Міхалова. У Заблудаве быў я 25 чэрвеня г.г. і вельмі знерваваўся. Распіска здзертая амаль дашчэнту, застаўся толькі маленькі кавалачак паперкі. На прыпынку было пад 10 пасажыраў і ўсе яны былі таксама абураны. Пыталіся: каму так свярбелі рукі, што знішчыў распіску?

Дырэкцыі ПКС у Беластоку падказваю аформіць справу як у Нарве. Там у краме, што знаходзіцца каля аўтобуснага прыпынка, памясцілі ў акне выразна раздрукаваную распіску курсіравання аўтобусаў. У Заблудаве таксама каля прыпынка ПКС ёсць прыватная крама і, думаю, з яе ўласнікам можна было б дагаварыцца — там ніхто распіску не панішчыць, а карысць будзе і пасажырам, і кіраўніцтву ПКС.

Мікалай Лук'янюк

Не плаціць багаты...

У пачатку дзевяностых гадоў, калі на тэрыторыі Чаромхаўскай гміны будаваўся водаправод, бурмістр Кляшчэляў папрасіў прадоўжыць водаправодную сетку на тэрыторыю трох салэцтваў: Рэпчычы, Дабрываду і горад Кляшчэлі. Чаромхаўскі самаўрад станоўча паставіўся да справы — гэтыя мясціны карыстаюцца зараз чаромхаўскім водаправодам. Па законе абавязаны яны плаціць не толькі за ваду, але і падатак ад маёмасці. Паколькі сетка водаправода знаходзіцца ва ўладанні гміны Кляшчэлі, дык падатак ад маёмасці, які складае ў год 500 зл., павінна гэтая плаціць у чаромхаўскую гмінную касу. Але не плаціць. Чыноўнікі з Кляшчэляў пасмейваюцца з чарамшукоў, што дапамінаюцца за ваду грошай. Быццам нямнога, але на працягу дзесяці гадоў сума складзе 5 тыс. зл. У народзе кажуць: не плаціць багаты, але вінаваты. На маю думку, у рыначнай эканоміцы кожны грош цэніцца. Ведаюць пра гэта чыноўнікі абодвух самаўрадаў. Смешна толькі, што адміністрацыя неакуратна ставіцца да законаў. **(ус)**

Гайнаўскі „Каўфлянд"

У пачатках гэтага года ў Гайнаўцы пачаў працаваць супермаркет „Каўфлянд". У супермаркеце даволі нізкія цэны. Для прыкладу, калі за памідоры ў Чаромсе плацілася па 4,50 зл. за кілаграм, дык у „Каўфляндзе" такія ж памідоры каштавалі 1,99 зл., агуркі, апельсіны ды лімоны таксама таннейшыя амаль напалову. Многія прадпрымальнікі прыязджаюць аўтамабілямі пад гандлёвы цэнтр ды купляюць тавар па нізкай цане, каб пазней прадаць яго на базары з прыбыткам. Вольны рынак. **(ус)**

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Максім са Студзіводаў

Ужо з самага ранку, калі на двары сонейка і ласкавы вецер, Максімка бегае па панадворку. Найбольш падабаюцца яму машыны таты, асабліва трактар і воз...

Максім хоча быць кіроўцам і гаспадаром. Пакуль для гэтага хапае звычайнай галінкі. Бярэ яе ў ручкі і са звонкім прыспевам гууу ганяецца па зялёным панадворку.

Максім — адзінае дзіця ў Студзіводах, якое размаўляе па-свойму.

— А калі прыходзяць дзяўчынкі з суседства, ён вучыць іх нашай мовы, — кажа мама.

Два гады таму мы памясцілі ў „Зорцы" здымак Максіма на гурбе змалочанага зерня. Хлапчук яшчэ не ўмеў хадзіць.

А зараз трохгадовы Максімка Фіёнік паклікаў мяне паказаць сваё поле. Яно акаляе яго сялібу.

Здымак зноў атрымаўся на фоне збожжа — у гэты раз зялёнага і сакавітага жыта ды рамонкаў.

Зорка

Фота ГАННЫ КАНРАЦЮК

Вершы Віктара Шведа

Баюся

Да бабулі нечакана
Унук малы звярнуўся:
— Хацеў бы даць табе бананы
Ды крышачку баюся.

— Баяцца ты зусім не мусіш,
Унучак мой прыгожы.
— Бабуля, я таго баюся,
Што ўзяць ты раптам можаш.

Дамашняя свіння

Настаўнік у класе
Спытаў Леваня:
— Адкуль узялася
Дамашняя свіння?

— Гэта ж дзік спрадвеку,
З мінуўшчыны сівой.
У сужыцці з чалавекам
Стаўся ён свіннёй.

Польска-беларуская крыжаванка н-р 29

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 25: Як, кроў, бал, сінеча, матыль, янтар, вір, мора, род, нож, ранг. Ян, гімн, мір, фанат, ода, лета, чырвань, бал, ружа.

Узнагароды, **запісныя кніжкі** (pamiętniki) выйгралі: **Марта Калінoўская** і **Наталля Сцепанюк** з Беластока. Віншуем!

		Koło / Zamek		Ranek / Lilia		Mit / Kawa				Marsz		Klik	
Jar	Świt						Irena / Obierki		Bank	Rdza		Kasza	
Malina							Ara						
	Bór / Oda							Orszak					
			Malwa		Pomarańcz								
	Klan					Arkada							

Час рыцараў

Святыя і язычнікі

Сярэднявечча ўспрымаецца намі як набожная і рэлігійная эпоха. Тады жыло многа святых як Еўфрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Меркурый Смаленскі ці Францішак Асізскі.

З другога боку, у той час людзі верылі ў ваўкалакаў і чары ды скрыта практыкавалі язычніцкія абрады. Купалле — язычніцкі абрад у гонар Сонца — святкавалі ў нас, на Падляшшы, яшчэ ў пачатку XIX стагоддзя. Этнографы запісалі такі абрад у Кляшчэлях і Орлі. Моладзь збіралася на скрыжаванні дарог за вёскай і паліла вогнішчы. Пры ўсім, рытуалы падтрымоўвалі старыя, яны верылі, што якраз у гэты дзень можна абясшкодзіць ведзьмы і чараўнікоў!

У адрозненне ад Заходняй Еўропы, у нас не спальвалі чараўнікоў на кастрах. У месцах схаваных ад свету — у непраходных пушчанскіх нетрах і дрыгве — сяліліся язычнікі, якія ні за што не хацелі прымаць хрысціянства.

Ці свет ёсць плоскі?

Вядома — не! Пра гэта ведалі ўжо старажытныя грэкі. Таксама і сярэднявечныя вучоныя ведалі, што зямля не ёсць плоскай. Аднак у сваіх навуковых разважаннях гадалі: ці па другім баку зямнога шара жывуць людзі? А калі так — ці ходзяць там дагары нагамі. І чаму не абвальваюцца яны ў бездань...

На такія пытанні ніхто не мог даць адказу. З другога боку, людзі верылі, што Зямля знаходзіцца ў цэнтры космасу. Што вакол яе кружыць Сонца і іншыя планеты. Пасля ўсе гэтыя міфы абвергне Мікалай Капернік з Торуні.

(працяг будзе)

Зорка

Белавежскія быліцы і небыліцы

Кот і сабака

Здарылася тое яшчэ за царом Гарохам, калі зямлі была толькі кроха, а па ўсёй гэтай крышынцы вада ўсюды бурліла. Людзей тады таксама было немнагавата, а звяроў дык зусім мала. І не дзіва, што тады кожны звер, малы ён ці вялікі, меў свой дакумент і вызначанае сталае месца, на якім жыць павінен. Усе звяры пільнаваліся сваіх гнёздаў і месцаў, па свеце не валачыліся.

У хаце аднаго чалавека жылі кот і сабака. Дружылі яны так моцна, што вадой лі — не разліеш, крукамі рві — не разарвеш. З аднаго чарапка елі, разам на шпацыр хадзілі, кот спаў на цёплым прыпечку, а сабака — у куточку пад ганкам. Жылі яны так сабе колькі часу, і надта ж абрыдла ім такая нуда.

— Што гэта за жыццё такое, — маўлялі. — Ні ты пабрашы на каго, ні ты да чужой печы прытуліся. Усё сядзі ды сядзі ў сваёй кучы, бы той кацмалух які!

Наракалі яны гэтак, наракалі ды і рашылі ў свет падацца. Пакінулі сваю хату і ў ёй месцы наседжаныя ды і пайшлі куды вочы глядзяць. Ідуць яны дзень, ідуць другі, а на трэці рэчка дарогу ім перагарадзіла. Сабаку рака — хоць бы што, але кот абмакнуў лапу ды і ходу ад вады.

— Меў бы я, — маўляў, — боты, перайшоў бы, але так, босаю нагою, ракі мне ніколі не перайсці.

— Га, вось табе і на! — усклікнуў сабака. — А дружба наша, дык што? Ці яна нічога не варта? Сядай, браток, на мае плечы, і раку як бач адолеем. Толькі мой дакумент вазьмі — наверсе яго зручней ад вады зберагчы.

Прымасціўся кот на плячах у сабакі. Свае і сабачыя дакументы ў зубы ўзяў, каб чаго добрага неўзнарок дзе не замачыць.

Апавядальніца Волечка Каліна

Добрыя і благія чарадзейкі

Гульня ў сонную каралеву

— У нашым класе амаль усе хочуць стаць акцёрамі, — кажа „Чарадзейка" з пятага класа. Яна сама марыць пра Галівуд. Гульня ў тэатр разбудзіла ў ёй цікавасць да дэкламацыі. Ад гадоў разам з сябрамі выступае ў „Родным слове" і ў польскіх, нямецкіх і англійскіх дэкламатарскіх конкурсах, якія арганізуе школа.

Оля Максімюк і Мацвей Севастыянік — каралеўская пара

У беластоцкай „чацвёрцы" дзве беларускія тэатральныя групы і ў кожнай за дваццаць акцёраў. Вядзе іх настаўніца Аліна Ваўранюк. Традыцыйна на развітанне навучальнага года дзеці выступілі са спектаклем для бацькоў, настаўнікаў і сваіх сяброў-палякаў. Іх спектакль, „Гульня ў сонную каралеву", адлюстроўвае стыль гуртка. Любімымі аўтарамі нашых сяброў ад гадоў тут спадарства Войцікі. Іх п'есы — перапрацоўкі класічных казак на сучасны лад. Тут найважнейшая ігра з традыцыйным сюжэтам, са словам і з уяўленнем. Вось, у п'есе „Гульня ў сонную каралеву", каб прыбраць „пыл стагоддзяў" прынц карыстаецца пыласосам. На хрысцінах у прынцэсы таксама школьна-сучасны матыў — гасцей частуюць жуйкай. Менавіта з-за абсусленай жуйкі, якая дастаецца адной чарадзейцы, нараджаецца праклён!

Школьны тэатр у „чацвёрцы" асаблівы на фоне нашых самадзейнікаў. Спектаклі, якія рэалізуе Аліна Ваўранюк, вылучаюцца дынамікай і цудоўнай крэатыўнасцю. Яе акцёры — адны зоркі. Каралеўская пара ў асобах Олі Максімюк і Мацвея Севастыяніка выклікала смех і страх. Калі каралева, герад-баба абуралася, па спіне гледачоў праходзілі дрыжыкі. Прыгнечаны асобай жонкі „кароль", бараніўся салодка-цудоўнай усмешкай і выклікаў мора смеху. Здаецца ў гэтай ролі ніхто не пераб'е Мацвея.

Непаўторная атрымалася роля Злой Чарадзейкі, якую з фантазіяй іграла Наталька Кандрацюк-Свярубская. Захапленне публікі выклікала таксама роля апавядальніцы. Тут бліснула Волечка Каліна (у час тэатральнага агляду яна атрымала ўзнагароду для найлепшага акцёра).

Калі ідзе пра сцэнічнае афармленне, яно сціплае. Ролю інтэр'ера выконвае каляровае палотнішча. Але, як кажуць — добрым акцёрам не патрэбны бліскучы дэкор. Тут найважнейшая ігра і гульня.

— Я магу сказаць адно, — кажа наша Чарадзейка, — мне хацелася б, каб ролі былі намнога даўжэйшыя і каб гульня ў тэатр адбывалася кожны дзень.

— Тэатр узбуджае цікавасць да ўрокаў беларускай мовы, — кажа настаўніца. Вось, з верасня на ўрокі будзе хадзіць дзяўчынка, якая дагэтуль прыходзіла толькі на тэатральны гурток.

Зорка

Рушылі яны плысці. Рака шырокая выдалася. Плывуць яны так, плывуць доўга ці коратка, і ўсё моўчкі. Сабаку і стала сумна.

— Як ты там, браток, наверсе маешся? — пытаецца ён у ката. — Ці часам не падмывае цябе вада?

Кот хацеў нешта сказаць, але слова вымавіць не можа — баіцца, каб дакументы ў ваду не ўпалі. Сабака ж да яго прыстае са сваімі размовамі — вядома, сабакі ўсе надта ж гаваркія.

— Нічым і не аказваешся, коце, ці не здрамнуў ты часам на сухім ды цёплым седзячы?

Кот і вельмі рад быў бы адазвацца да сябра, але ўсё за лёс сваіх ды сабачых дакументаў дрыжыць.

— Ага, табе, відаць, самому паплаваць захацелася, — узлаваўся сабака, калі яны якраз на сярэдзіне ракі былі. — Ну, прэч з маіх плеч!..

— Браточку, міленькі, не губі ты мяне, — заверашчаў тут на ўсё горла кот ды давай хваліць ды выхвальваць сабаку і ўвесь яго род за розум вялікі, таленты небывалыя ды непарушную дружбу.

Паперы ж тым часам — бух! — у ваду і паплылі сабе. Бачыць кот, якая бяда здарылася, але пра гэта ні слова не кажа сабаку. Баіцца, каб той часам яго ў ваду не спіхнуў і разам з тым жыцця не пазбавіў.

Шчасліва даплылі яны да берага, і тут сабаку ўсё ясна стала. Спачатку ён словамі на ката накінуўся, потым жа і зубы ашчэрыў. Кот пачаў тлумачыць ды бараніцца. Ад слоў і пагрозаў неўзабаве і да ўчынкаў перайшлі, у бойку кінуліся. Сабака ўсё намерваўся ката на кавалкі разарваць, а той так і ладкаваўся сабаку вочы выдзерці.

І так вось з таго часу дзяруцца яны ды па свеце адзін другога ганяюць. Жывуць жа дзе прыдзецца: рады тым, калі чалавек які-небудзь іх прыгорне ў сваю сялібу.

Людзі ж тое заўважылі і кажуць пра тых, хто вечна сварыцца ды дзярэцца: жывуць, як той кот з сабакам.

Міклашэва

Міклашэва — вёска ў Нараўчанскай гміне. Была яна заснавана на тэрыторыі фальварка Гарадзіска ў 1632 годзе. Раней называлі яе Міклашэўшчынай або Міклашоўкай. Сваю назву вёска ўзяла праўдападобна ад першага жыхара — Міклаша.

Першым уладальнікам вёскі быў Іосіф Карп, потым належала ягонаму сыну Станіславу, які зрокся правоў да яе.

Да вайны пражывала тут 400 чалавек. 30 ліпеня 1941 года гітлераўцы перасялілі людзей у вёску Фальваркі. Усё дабро зрабавалі, а хаты спалілі. Некаторых людзей забралі на прымусовыя работы ў Нямеччыну. Пасля вайны вёску адбудавалі.

У 1979 годзе жыло тут 350 асоб, сёння — 218. Ёсць тут таксама хутары. Адзін з іх называецца Дзікі Захад, мабыць, таму, што знаходзіцца ён у далёкім ад вёскі лесе.

Пасля вайны ў вёсцы было многа дзяцей і моладзі, але не было школы. Дзеці вучыліся ў хаце спадарства Раманчукоў. У 1958 годзе пачалася пабудова школьнага будынка. Быў ён невялікі, тут былі толькі чатыры залы, у якіх вучылася па адным класе. У сямідзесятыя гады школа перастала існаваць, а дзеці пачалі вучыцца ў Нараўцы. У апусцелым школьным будынку спачатку была крама, кіёск, а потым вясковая святліца, у якой арганізавалі дыскатэкі і гульні. З цягам часу будынкам старой школы людзі перасталі цікавіцца і ён горбіцца пад цяжарам часу.

У канцы 70-х гадоў у вёсцы быў арганізаваны беларускі фэст. Прынялі ў ім удзел народныя калектывы, у тым ліку калектыў з Міклашэва, які заснавала Яўгенія Богуш. Мерапрыемства адбылося перад школьным будынкам. Гэтую імпрэзу мясцовыя людзі ўспамінаюць яшчэ сёння. Калісьці ў вёсцы быў таксама драўляны млын і кааператыў з сельскагаспадарчымі машынамі. Сёння гэта ўжо толькі ўспаміны.

Цяпер хаты ў вёсцы прыгожыя, дагледжаныя. На панадворках зялёная трава, а ў агародчыках растуць кветкі. Усе людзі вельмі дбаюць пра свае панадворкі, некаторыя займаюцца агратурыстыкай. Многа людзей ужо на пенсіі, але ёсць і такія, якія яшчэ працуюць, галоўным чынам на чыгунцы і на гаспадарцы.

У 1997 годзе ў вёсцы былі пракладзены тэлефонная лінія і водаправод.

Інфармацыю пра сваю вёску сабраў **Патрык Богуш**, школа ў Нараўцы

Незабудкі Надзеі з Гарадка

Маладую Надзею зняў у Крынках фатограф Лапуць

Надзея з Пракопчыкаў Дудзікава, старажылка з Гарадка, ноччу не ляжа, аж выслухае апошніх вестак, што ў свеце дзеецца. Дзе людзі змагаюцца, дзе бяда якая ці крыўда. Шкада людзей. Моліцца, каб вайны ў нас не было.

Колькі гадоў? Надзея Дудзік смяецца: усяго дзевяноста другі пайшоў леташняга 29 снежня. „З дактарамі не знаюся...", — пачынае сваю новую рыфмаванку, там і пра чарачку, якая не дае пастарэць. Жартаўлівыя, дасціпныя вершыкі ходзяць ёй па ўсё нестарой галаве. Але друкавала і гімн грамадоўцаў, і вершы аб тым, як „Гарадок пачырванеў": *Яшчэ вас не было на свеці,/ як ён ужо гэта імя меў./ КПЗБ яму гэта імя дала,/ Як вы ў праекці яшчэ былі/ А тыя, што яго зрабілі чырвоным,/ У магілах без пары палягалі./ А вы радзіліся шчаслівымі/ На гатовае ўсё прыйшлі/ Аўтарытэты заваявалі/ І медалёў многа знайшлі...* А яна ў КПЗБ была ад 1933 года. У іхнай хаце пару разоў быў Браніслаў Тарашкевіч. У хаце земляробаў, свядомых беларусаў.

Яна ў вёсцы Плянта (Новая Свідзілаўка) каля Крынак, сярод сямі дзяцей *у беднай вёсачцы нарадзілася, дваццаць тры гадочкі там пражыла*. Разам з мамай *сярпочкам у полі жыта жала/ і на чужы загон за грошы йшла./ Тады прыладамі бывалі/ Каса, сярпочак, а ўзімку цэп,/ А ўсе так цяжка працавалі/ На гэты чорны з жорнаў хлеб*. Двухгадовай дзяўчынкай апынулася ў бежанстве — у сяле Салёная на Украіне. Вярнуліся без бацькі ў 1920 годзе. Высваталі яе ў 1937 годзе за Аляксандра Дудзіка з Гарадка. Мусіла забыць аб сваім каханні, Янку, які назаўжды застаўся на здымку ў сваім беларускім нацыянальным касцюме. Рабіла і ў дзяржаўных лясах, і ў Гарадку — на полі ад цямна да цямна. Ад жніўня 1977 года яна — удава. У сваёй адноўленай хаце жыве, па вуліцы Міхалоўскай, 49, у атачэнні дамоў сваёй радні. Ды не ўседзіць — мусіць ведаць, дзе што як, хто прыехаў, хто выбыў, з самое гміны, мястэчка, што там у краіне. Прыедзе прэм'ер Цімашэвіч, улюбёнец нашых жанчын, дык і па-наскаму яго прывітаць трэба — Надзя Дудзік паднясе ўласнаручна вышываную макатку. Вершам прывітае вясельных гасцей у гарадоцкім пажарніцкім дэпо. Першая ідзе на галасаванне, каб выказацца за тымі, хто найлепш будзе прадстаўляць народ. А калі вершы пішуцца — тыя, якія чытае на мерапрыемствах — тутэйшых, сваяцкіх, і перад іншымі паэтамі — і з гарадоцкіх „Каласоў" (што выдалі супольную кнігу ўсе „Życiem pisane"), і на сустрэчах народных паэтаў, якія арганізуе Ваяводскі асяродак анімацыі культуры (паэтычныя „Сенакосы", „Растопы"...)? Найлепш у лесе, пад спеў птушак, выліваецца рыфма... Пра звычайны лёс селяніна, пра братоў-змагароў Міхася і Вінцука, якія ўжо ў магіле, пра сваіх сясцёр-прыгажунь Соньку, Сашу ды Верку-блізнючку Надзіну... Пра змагарны Гарадок, дзе і мова беларуская ў міжваенны час моцна стаяла, таварыска, і рабочы народ — і беларускі, і жыдоўскі, і польскі ведаў, хто яны ёсць. Цяпер вершы пішуцца пра той Гарадок, дзе прапала апошняя тэкстыльная фабрыка, дзе маладыя людзі, пэўна, трактуюць такіх сівагаловых ідэйнікаў з паэтычным ухілам, старых рамантыкаў звычайнымі дзівакамі.

Фота з архіва

У падарунак міністру

— Jeszcze pani chodzi? — пытаецца на гарадоцкай вуліцы суседка, скажам, Юзэфа.

— A co pani szkodzi? — смяецца Надзея, страпянуўшы сівай завіўкай на бадзёрай галаве. — Пытаюцца ў мяне: „А што ты так робіш, што ў цябе кветачкі як жывыя выходзяць?" Гэта пра мае макаткі.

„Браткі! Не забывайце роднае мовы!" — такая макатка аздабляла ніўскія сцены. На цёмным фоне — браткі і незабудкі.

Міра Лукша

Вёска з будучыняй

Ад асфальтавай шашы, што з Міхалова ў Падазераны, кіруюся ў Леўшы сонечнай жвіроўкай. Задзіўляе мяне від, якога ўжо, здаецца, не павінна быць нават пад нашым небам. Як у сівую мінуўшчыну, крочыць па абшырным зялёным полі гаспадар з сявенькай, рассявае ўгнаенні. Кранаю размовай ягоную адсталую земляробчую тэхніку:

— Не хочаце душыць збожжа машынамі?

Ён падтаквае, а я кранаю будучыню, пытаю, ці падаў ён заяўку на еўрасаюзныя даплаты.

— Усе мы падалі, толькі не ведаем, ці што з гэтага атрымаецца.

Спыняецца пры нас жанчына з веласіпедам. Кабета дапытлівая, цікавіцца, што за чужынец завітаў у іхняе старонне. Калі кажу ёй, што я з „Нівы", весялее:

— Там мая суседка працуе!

— Ну?

— Міра Лукша.

— То вы тут замужам?

— Ага.

— Значыць, родам Вы з Медзвядзёў?

— Так; мая і Мірына хаты стаялі недалёка адна ад аднае.

Жанчына жыве ў Азяблах і падаецца ў Леўшы, дзе замужам яе дачка. У Азяблах усе пенсіянеры, а азяблоўскія гаспадаркі абрабляюць ляўшоўскія земляробы. Мая суразмоўніца наракае на сялянскі лёс, на долю дачкі, якой усё трэба дапамагаць. А ж з уваходам у Еўрасаюз трэба мадэрнізаваць усю гаспадарку, трэба пабудаваць чысты даільны адсек, бо інакш спыняць прыём малака. Пра сейбіта, якога пакідаем з ягонай сявенькай, кажа, што сее ён уручную, бо не мае трактара.

Кіруюся да солтыса. Солтыс Леўшаў у Міхалове, у хаце толькі ягоная жонка Анна Флёрчук. Распытваю пра мясцовых гаспадароў.

У Леўшах пецярых земляробаў, найстарэйшаму з іх сорак пяць гадоў. Старыя бацькі дапамагаюць маладым. Чацвярых гаспадароў разводзіць кароў, а пяты свіней; апошні ўсё мусіць дакупляць збожжа на корм. Рэзервуар на малако мае пакуль адзін толькі гаспадар. Найгорш з пашай, якой мала каля вёскі. Уваходзячы ў вёску здзівіў мяне яшчэ від кароў, што хадзілі па зялёным аўсе; гаспадар на лета пасеяў для пашы авёс, а восенню пасее там жыта, каб навесну пасвіць кароў зялёнай рунню. Адзін гаспадар, які жыве сярод паш і па бацьках наследаваў машыны, трымае каля шасцідзесяці кароў.

Сам солтыс да канца мінулага года працаваў на капальні торфу ў Імшары. Рабіў па 10-12 гадзін, зарабляў па 500-600 злотаў у месяц, у сезон месяц-два прыносіў і па тысячы. Усе грошы выдавалі на кароў і рамонты. Дойных кароў у іх каля дваццаці і каля дзесяці маладняку. І яшчэ трэба разбудоўваць гаспадарку, каб акуратна адводзіць сцёкі з-пад кароў. Мабыць, давядзецца браць крэдыт.

Ёсць трывогі, ёсць і радасці. У Леўшах усе гаспадары сямейныя! Няма такіх, што без дзяцей жывуць. Вёска малая, але з яе ў школу ад'язджае цэлы „Асінобус" дзяцей!

На канцы вёскі, што з боку Імшару, стаіць цэментны крыж з арыгінальным надпісам: „Boże, daj miłość, pokój i zgodę, a duszom w czyśćcu wieczną ochłodę". А мне на душы пацяплела...

Аляксандр Вярбіцкі

Каб нас не забылі

Калі я працаваў лістаношам, на сваім участку выявіў некалькіх сваіх верных сяброў і паслядоўнікаў роднага слова; у першую чаргу была гэта сям'я Тоніка і Люсі Мрук з Тапоркаў у Кляшчэлеўскай гміне. Іх дзеці — сын Сцяпан і дачка Ала — гэта адукаваныя і разумныя людзі. Ад сустрэч з імі асталося ў мяне шмат добрых уражанняў. Сцяпан — настаўнік англійскай мовы і палымяны любіцель рускай і беларускай літаратур, а Ала — магістр русістыкі (і жонка ніўскага журналіста Аляксея Мароза).

У Тапарках наведаў я Аркаша Бярозу. Гэта старэйшы ўжо дзядзька, але рэдкі талент і верны прыхільнік беларускай мовы і нашага тыднёвіка. Пра яго я калісь у „Ніву" пісаў, але, думаю, што цяпер пра гэтага чалавека журналісты павінны зрабіць грунтоўны матэрыял. Спадар Бяроза ведае шмат беларускіх, рускіх і польскіх вершаў і песень ды можа гадзінамі іх дэкламаваць, а таксама расказваць цікавыя гісторыі аб нашай спадчыне. Ён ведае беларускія вершы нязнаныя маладому пакаленню. Мне спадар Бяроза бачыцца жывой энцыклапедыяй і гісторыяй, якімі варта пакарыстацца.

Мікалай Панфілюк

Купалле ў Белавежы

Субота, 3 ліпеня 2004 года. У гэты дзень Галоўнае праўленне БГКТ супольна з уладамі Белавежскай гміны ўжо дваццаты раз традыцыйна арганізуюць святкаванне беларускага „Купалля" ў Белавежы. Пасля абеду ў пушчанскі пасёлак прыязджае шмат людзей з многіх вёсак і гарадоў Беласточчыны, а нават з-па-за яе. Размяшчэнне легкавых машын і аўтобусаў рэгулююць парадкавыя службы і паліцыя.

Непадалёк амфітэатра, з якога паплылі беларускія песні, размясціліся кіёскі з ласункамі, харчамі і півам ды сувенірамі з саломы і драўніны. А ў лясочку на траве расселіся групкі людзей, якія частаваліся, сардэчна размаўлялі і спявалі. Усюды адчуваўся ўрачысты, святочны настрой.

Перад 21-й гадзінай пры мясцовым Доме культуры сфармавалася калона з харавых калектываў, якая з вянкамі, музыкай і песняй „Купалінка" паўкіламетровай дарожкай з запаленымі факеламі крочыла ў напрамку амфітэатра. Да калоны-карагода далучаліся людзі і ішлі, спяваючы разам з калектывамі.

Нязвыклае, цудоўнае, непаўторнае шэсце. Яго выглядалі, яго чакалі, а калі карагодная калона праходзіла, людзі апладысментамі выражалі сваю ўдзячнасць ад сустрэчы з беларускай песняй, якая спадарожнічала ўрачыстай купальскай непаўторнай ночы.

„У купальскую ноч расквітае папараць кветка, і тыя, якія яе знойдуць, будуць шчаслівыя. Гэтае павер'е, звязанае з земляробчым святам, з парой найбольшага росквіту жыватворных сіл Зямлі, ушаноўвалі нашы продкі, якім пры ўсіх дзеяннях спадарожнічала беларуская песня. І таму наша Купальская ноч гэта выражэнне беларускага этнасу", — гаварыў старшыня ГП БГКТ і адначасова член Маршалкоўскай управы Падляшскага ваяводства Ян Сычэўскі, адкрываючы ўрачыстасць. А прывітала ўсіх, у тым і дастойных гасцей, войт гміны Анна Байко. Мерапрыемства ўдастоілі дыпламаты ды прадстаўнікі ўлад і самаўрадаў Беластоцкага ваяводства, у тым ліку амбасадар Беларусі ў Польшчы Павел Латушка, генеральны консул РБ у Беластоку Леанід Каравайка, падляшскі ваявода Марэк Стшалінскі і віцэ-ваявода Ежы Паўяновіч.

Гурт „Куранты" ўражвае высокім мастацкім узроўнем

З прыгожымі, вершаванымі віншаваннямі выступілі вядучыя канцэрт Ева Ласкевіч і Аркадзь Якімюк. Яны жадалі, «каб усе прыбылыя на „Купалле" добра гулялі і каб ніколі гора не зналі».

Купальскі канцэрт распачалі „Прымакі" традыцыйнай песняй „Купалінка". Затым на сцэну выйшаў харавы калектыў БГКТ з Беластока „Крыніца" і адразу паплыла мілагучная песня:

Ой, у полі крыніца,
Там халодна вадзіца...

Віктар Маланчык кіруе не толькі „Крыніцай", але дырыжыруе таксама найстарэйшаму хору „Расспяваны Гарадок", які праспяваў малавядомую песню:

У Яніны імяніны, дзе гуляе гамана,
Ля Яніны ўсе мужчыны, а сумую я сама...

Затым вядучыя запрасілі на сцэну мужчынскі гурт „Куранты" з Бельска-Падляшскага, мастацкім кіраўніком якога з'яўляецца Аліна Негяревіч. Гэты гурт робіць уражанне: усе ў чорных касцюмах, з нотнымі кніжкамі, спяваюць на высокім мастацкім узроўні.

Аліна Негяревіч кіруе таксама хорам Гайнаўскага дома культуры. Так як усе калектывы і гэты хор выканаў дзве песні. Адной з іх была „Чарачка на пасашок".

Вельмі добра праявіла сябе гайнаўская шасціпарная танцавальная група „Перапёлка" з тамашняга Дома культуры. Уваходзіла яна на сцэну некалькі разоў і заўсёды з іншым танцам і ў іншых уборах.

У царкве вясковай шлюб з табой мы бралі
Перад Богам і перад людзьмі...

Так пачынаецца песня „Вёсачка", якую спяваў гурт „Лідэр" з Беластока. Заўсёды яна цёпла ўспрымаецца прысутнымі на канцэртах. Так было і цяпер.

Хор „Лучына" з Беластока падрыхтаваў песню з наступнымі словамі:

Ой, аралі хлопцы ніву, выаралі ярмо,
Заплаці мне дзяўчынонька,
што я хадзіў дармо.
А я табе казачэнька плаціла, плаціла,
Цалаваў маё лічэнька я й не бароніла.

Затым сваё майстэрства прэзентавалі хоры „Васілёчкі" з Бельска-Падляшскага, „Чыжавяне" з Чыжоў, „Арэшкі" з Арэшкава і „Цаглінкі" са Старога Ляўкова (усе тры з Гайнаўскага павета), варшаўска-беластоцкае трыо „Зязюлькі", „Рэчанька" з Козлікаў (Беластоцкі павет), і „Каласкі" з Беластока. Іх выканаўства спадабалася белавежскай аўдыторыі, якая ўзнагародзіла іх моцнымі воплескамі.

Ала Каменская, выдатная салістка БГКТ, заўсёды захапляе прысутных сваім прыгожым голасам. Заспявала яна сола дзве песні і дзве з харысткамі „Каласкоў".

І ўрэшце пара выказаць глыбокую ўдзячнасць гасцям з Беларусі, калектыву „Неруш" з Мінска і яго мастацкаму кіраўніку Валянціне Гладкай, заслужанаму дзеячу культуры РБ. Гэтая маленькая група з пяці чалавек так прыгожа пяе і танцуе, ажно душа радуецца, што на нашай этнічнай Бацькаўшчыне ёсць такія таленты. Група выходзіла на сцэну некалькі разоў.

Канцэрт закончыўся песняй „Купалінка" ў выкананні гурту „Прымакі" і яго кіраўніка Юркі Астапчука, які бавіў публіку.

Неўзабаве ўспыхнулі рознаколерныя феерверкі. Цікавае відовішча! А пасля маладыя дзяўчаты з паасобных калектываў з песняй „Купалінка" панеслі вянкі і апусцілі іх у рэчку. Велічна паплылі вянкі з запаленымі свечкамі. За імі прабавалі плысці некалькі асоб. А затым на пляцоўцы пры амфітэатры распачаліся танцы пад музыку гурту „Лідэр".

Міхась Хмялеўскі

Перасяленчы лёс

Успаміны Ігнася ПЕТРУЧУКА з Мінска, народжанага 13 студзеня 1939 года ў Сацах Нарваўскай гміны.

(заканчэнне з папярэдняга нумара)

Наша сям'я рашыла будаваць дом. Далі нам дзялянку лесу, мы пілавалі той лес, прывозілі, будаваліся. Цэглу бралі з раскіданых дамоў, не ведаю, ці гэта было легальна.

Брата Васіля ў 1945 ці 1946 годзе, хаця яшчэ не скончылі будаваць дом, прызвалі ў Крычаве ў армію; служыў ён на Слонімшчыне.

Вясною 1945 года зямлю засеялі. У нас не збіралі змёрзлай бульбы, так як у калгасах. У калгас мы не ўступалі, бо, мабыць, была нейкая дамова, каб перасяленцаў цягам дзесяці гадоў у калгас не браць. Але пасля гэту дамову парушылі і сталі гаспадароў абкладаць вялікімі налогамі. Мы жылі з коней — аралі, сеялі калгаснікам, наймала нас сельпо — вясковая крама — вазіць соль на санях. Пасля забаранілі трымаць коней. Калі заганялі людзей у калгас, спярша адбіралі ім коней, а без каня селянін быў вымушаны запісвацца калгаснікам (калі б цяпер сяляне мелі коней, на Лукашэнку ніхто не галасаваў бы). Прыехалі і да нас забіраць кабылу, брат Сцяпан, 1933 года нараджэння, супрацівіўся і яго засудзілі на тры гады, сядзеў у Беларусі.

Многія людзі былі раздзелены мяжой. З васьмі сем'яў, што ў Пабедзе ў зямлянках жылі, чатыры выехала ў Гродна, бліжэй сваіх сем'яў. Стала раз'язджацца моладзь.

Мой брат Мікалай у Германіі ўцякаў ад гаспадара, яго злавілі і трапіў у канцлагер. Калі канцлагер занялі саветы, яны хацелі забраць брата ў армію, але ён адмовіўся, бо быў пяцідзесятнікам. Засудзілі яго за гэта на дзесяць гадоў, ён трапіў у Караганду. Пасля гаварыў нам, што камуністы нават фашысцкага падноска не варты, настолькі былі жорсткія. Калі ў Германіі немец ударыў брата ў твар, брат падстаўляў яму другі бок, і немцу ўжо рука на яго не паднімалася. Калі ж тое самае ён рабіў пры энкавэдзістах, гэта дзейнічала на іх як чырвонае палотнішча на быка. Яны брату іголкі пад ногці забівалі, заціскалі пальцы ў дзверы, трымалі ў бараках на саракаградусным марозе ад чаго брат прастудзіўся, захварэў туберкулёзам і яго ў 1948 годзе адпусцілі. Ён ажаніўся і жыў у Слоніме. Мы доўга яго шукалі і ён нас знайшоў. Калі аслаб, прыехаў да нас і ў нас памёр. І ён мяне заразіў туберкулёзам, але не лёгачным, але каленнага сустава, куды пайшоў туберкулёзны працэс.

Атрымлівалі амерыканскую гуманітарную дапамогу — кансервы і вопратку. Пісалі ў газетах пра кампенсацыю перасяленцам, мама шмат хадзіла дабівацца яе, але безвынікова.

Старэйшыя браты пад Польшчай хадзілі ў школу. Пад немцам у Сацах школы не было і ніхто з нашай сям'і тады не вучыўся. Паўтара кіламетра ад Пабеды была школа ў Залесавічах. Але наша сям'я бедная была. Сястра з 1935 года і на год малодшы брат не ішлі ў школу, бо не было ў што апрануцца. Мы вучыліся дома — вучылі нас мама і старэйшы брат, яны ўмелі па-беларуску. Пасля я пайшоў адразу ў трэці клас, а малодшы брат — у другі.

У Залесавічах было чатыры класы і з пятага класа я пайшоў у Крычаў. Хадзіў пяшком або ездзіў на веласіпедзе, а калі нага стала балець, тады падвозілі мяне на кані, або знімалі ў горадзе кватэру. Было крыху грошай, бо брат ездзіў на захад, купляў там масла, мы яго ў малыя кавалкі расфасоўвалі і прадавалі. А пасля брата паклікалі ў органы і папярэдзілі...

У Крычаве цяжка дыягнаставалі маю хваробу і паслалі ў Магілёў; там устанавілі, што туберкулёз, далі скіраванне ў сельскую бальніцу. А там хірург заключыў: „Нікакой у вас туберкулёз!" Станавілася ўсё горш, давялося хадзіць на кастылях і наймаць у Крычаве кватэру.

Дырэктар школы, ваенны адстаўнік, не любіў мяне. І раптам клічуць мяне да яго. І ён гаворыць са мною ўжо зусім па-другому — мабыць нехта ў райкаме звярнуў яму ўвагу. Далі мне пуцёўку ў санаторый у Рэчыцы, але ўжо было запозна для вылячэння і адзін мой сустаў не працуе.

З дзесятага класа далі мне пакой у школе і так я канчаў школу. Пасля школы запісаўся на трохмесячную камандзіроўку на цалінныя землі. Жыў у горадзе, дзе большасць жыхароў складалі ўкраінцы, якія там пасяліліся ў царскі час. Там я ўпершыню пазнаёміўся з чачэнцамі, якіх туды перасяліў Сталін. Яны былі баявітыя, і хаця іх нямнога было, аднак усё насельніцтва падпарадкоўвалася ім. Я там зразумеў, што цаліна не мне і ў наступным годзе паступіў у Гродзенскі медінстытут.

Запісаў Аляксандр Вярбіцкі

Распрацоўшчыкі вітаюць нас і запэўніваюць, што ў іхным партале мы зможам „знайсці адказ на любое пытанне адносна беларускай народнай творчасці і традыцыі"...

falklor.at.tut.by

Народныя традыцыі заўсёды цікавяць кожнага чалавека, які, хай сабе час ад часу, але мае жаданне больш даведацца аб гісторыі свайго народа, высветліць тыя ці іншыя абставіны жыцця продкаў. Звычайна, усе народныя песні, танцы, адзенне і шмат чаго іншага цяпер прынята называць звонкім словам „фальклор". Віртуальна дакрануцца да фальклору беларускага нам дапаможа Інтэрнэт, а дакладней сайт па адрасе http://falklor.at.tut.by.

Варта адразу адзначыць, што сайт абсалютна новы. Час яго з'яўлення ў сусветнай павуціне — пачатак бягучага месяца. Але ўжо сёння ёсць на што паглядзець і, нават, пачытаць.

Галоўная старонка сайта — някідкая. На белым фоне манітора ў верхнім левым вугле высвечваецца нешта падобнае на крыж, складзены з паясоў з беларускім арнаментам. З левага боку — назва сайта „Фальклор беларускі", побач — інфармацыя аб спонсары, а над назвай — рубрыкі.

Распрацоўшчыкі вітаюць нас і запэўніваюць, што ў іхным партале мы зможам „знайсці адказ на любое пытанне адносна беларускай народнай творчасці і традыцыі". Гэта, канешне, вельмі прыемна, але на даны момант не зусім адпавядае рэчаіснасці. З усяго зместу, які кораценька падаецца на галоўнай старонцы, маем магчымасць набыць грунтоўныя веды аб адзенні беларускага насельніцтва. І гэта, на жаль, на сённяшні дзень усё.

Рубрыка „Адзенне", якая размешчана ад пачатку пералічэння рубрык, вельмі змястоўная. Зазірнуўшы на яе, інтэрнэтны карыстальнік можа пазнаёміцца з тымі асаблівасцямі адзення беларускага насельніцтва, якія складваліся цягам стагоддзяў, убіраючы ў сабе дэталі і запазычанасці ад іншых народаў. Рубрыка змяшчае ў сабе цалкам кнігу „Беларускае народнае адзенне", якая выйшла ў Мінску ў 1975 годзе. Прачытаць яе ў друкаваным варыянце сёння даступна далёка не кожнаму, але выратоўвае Інтэрнэт. Матэрыял, пададзены на сайце, перадае главы кнігі, сярод якіх „Жаночы касцюм", „Мужчынскі касцюм", „Адзенне іншых нацыянальнасцей у Беларусі", „Адзенне сялянскага насельніцтва савецкай Беларусі".

Нягледзячы на даволі паважаны ўзрост калісьці сабранага матэрыялу, цяжка пераацаніць яго вартасць для тых, хто цікавіцца апісаннем беларускай нацыянальнай вопраткі і абутку. Усё апісваецца настолькі падрабязна і даходліва, што здаецца сам бачыш тое адзенне ці боты, бо электронны варыянт кнігі, на жаль, не ўтрымлівае малюнкаў. Што, канешне ж, ёсць важкай яго хібай.

Калі ж вярнуцца на галоўную старонку і паглядзець на, так бы мовіць, патэнцыйны змест сайта, то сярод пададзеных рубрык ёсць „Рамёствы", „Гульні", „Танцы", „Вусная творчасць", „Абрады" і ўзгаданыя вышэй „Спевы".

Распрацоўшчыкі таксама запрашаюць наведвальнікаў падзяліцца сваімі ўражаннямі і прапановамі праз рубрыку „Гасцёўня" альбо дасылаючы паведамленні на пададзены побач адрас электроннай пошты. У сувязі з надзвычайнай „моладасцю" сайта рэальна скарыстацца можна толькі апошнім варыянтам кантактавання.

Будзем спадзявацца, што ўсе планы распрацоўшчыкаў „Фальклору беларускага" знойдуць свой працяг у рэчаіснасці, бо магчымасць вывучэння беларускіх народных традыцый праз Інтэрнэт зацікавіць даволі шырокую аўдыторыю не толькі спецыялістаў, але і звычайных людзей.

Уладзімір Лапцэвіч

Дэбютавалі беларускія тэнісісты ў Кубку Дэвіса дзесяць год таму — у 1994, пачаўшы з турніру адной з груп Еўра-Афрыканскай зоны (трэці дывізіён у іерархіі)...

Беларусь, беларусы...

За 10 год у элітны свет

У канцы верасня г.г. адбудзецца гістарычны для Беларусі тэнісны матч. У паўфінале Кубка Дэвіса — сама прэстыжнага камандавага турніру — нашы суайчыннікі сустрэнуцца з дружынай ЗША. Гульні пройдуць за акіянам, а ў разе перамогі Беларусі фінал кубка Дэвіса будзе прымаць Мінск.

У лютым у 1/8 розыгрышу беларусы перамаглі тэнісную дружыну Расіі — 3:2, потым у красавіку разграмілі Аргенціну — 5:0. Але шлях да паўфіналу быў вельмі доўгім, пакручастым і цярністым. Асаблівых традыцый у вялікім тэнісе Беларусь не мела. Сама вядомыя беларуска-савецкія тэнісісты — Сяргей Цяцерын (цяперашні галоўны трэнер нацыянальнай дружыны, паводле тэрміналогіі віду спорту — капітан), Уладзімір Драгун (яго ўжо няма на свеце) і Сяргей Леанюк (ён меў сталае месца ў зборнай СССР, пасля завяршэння кар'еры асеў у Маскве, стаў там вядомым трэнерам, любіў пагуляць з прэзідэнтам Барысам Ельцыным). Была яшчэ самародкавая Наташа Зверава, якая стала бронзавай прызёркай алімпіяды 1992 года. Дэбютавалі ж беларускія тэнісісты ў Кубку Дэвіса дзесяць год таму — у 1994, пачаўшы з турніру адной з груп Еўра-Афрыканскай зоны (трэці дывізіён у іерархіі). Менавіта тады ў складзе дружыны пачалі выступаць 16-гадовы Уладзімір Ваўчкоў і 17-гадовы Максім Мірны — цяперашнія лідэры. Першымі супернікамі былі экзатычныя ў тэнісным свеце Алжыр, Бенін, Тога, Камерун. Усіх іх бел-чырвона-белыя перамаглі і выйшлі ў другую лігу.

Пераход у элітную групу быў куды цяжэйшым — на гэта спатрэбіліся чатыры сезоны. Пасля гэтага ў асноўную сетку кваліфікацыйнага раунда Сусветнай групы беларусы прабіліся з трэцяй спробы. У 2000 і 2002 гадах былі жорсткія паразы ў гасяцх на так не любімых нашымі земляных „марудных" кортах — па 0:5 ад Швейцарыі і Аргенціны. І толькі ў верасні 2003 года прыйшла важная перамога над моцнай дружынай Германіі — 3:2 на чужой пляцоўцы, якая адкрыла дзверы ў вышэйшы свет. Далей былі згаданыя гістарычная вікторыя над Расіяй і пераканаўчы рэванш за даўнюю „крыўду" ў аргенцінцаў. Усяго за дзесяць год у Кубку Дэвіса Беларусь выступіла ў 26 матчах, з якіх выйграла 19, а саступіла ў сямі. Гіпатэтычная перамога над амерыканскай дружынай стане юбілейнай. Шанцы пэўна ёсць. Па-першае, тэнісная каманда ЗША не такая магутная, як гадоў 5 таму. Па-другое, змагацца давядзецца напэўна на „хардзе", а на такіх „хуткіх" кортах беларусы могуць выявіць свае лепшыя якасці.

На нядаўна прайшоўшых турнірах Вялікага шлема беларусы выступілі не надта ўдала. На французскім „Ралан Гарос" Уладзімір Ваўчкоў прайшоў тры раунды кваліфікацыі, а ў далейшай сетцы прайшоў аднаго суперніка — моцнага чэха Штэпанека. „Пасеяны" ў асноўнай групе Максім Мірны выбыў у першым жа крузе. Больш удала па традыцыі ён выступіў у парным разрадзе, прабіўшыся з індыйцам Бхупаці ў паўфінал. На траве Уімбдона Ваўчкоў не выступаў, а Мірны выбыў пасля першага ж раунда.

Напярэдадзе яшчэ алімпіяда ў Грэцыі. А пакуль Мірны, які ёсць рэкламным „тварам" вядомай тэлефоннай кампаніі „Velcom", узяў свецкі шлюб са сваёй абаяльнай нарачонай Ксеніяй. Гэтая пара ў час, калі многія з „зорак" робяць папулярнасць на скандалах, ёсць у Беларусі ўзорам сямейнасці. Цікава, што задоўга да цывільнага шлюбу Макс і Ксенія павянчаліся ў праваслаўнай царкве.

Уладзімір Хільмановіч

Браты-славяне...

Як у анекдоце

Не так даўно давялося мне прачытаць у Інтэрнэце анекдот, які мог бы напэўна кагосьці рассмяшыць. Мне аднак было не да смеху: у памяці ўсплылі падзеі — цюцелька ў цюцельку як у тым анекдоце.

Анекдот быў такі. Сустракаюцца праз многа гадоў пасля заканчэння універсітэта тры сябры: пазнаняк, варшавяк і кракус. Сустрэліся і адразу вырашылі наладзіць „імпрэзу". Варшавяк гаворыць: „Я стаўлю найлепшую гарэлку!" Пазнаняк дадае: „Ну, дык я даю найлепшую вялікапольскую каўбасу!" Урэшце адгукнуўся кракус: „Ну, дык я бягу па свайго швагра!".

І менавіта з-за гэтага „швагра" пішу сёння тэкст. Бо рэчаіснасць, у якой я апынулася ў нейкі момант, была яшчэ горшая.

Сваяк з Беласточчыны, даволі заможны селянін і вельмі сімпатычны чалавек, запрасіў гасцей на праваслаўныя Каляды. Было крыху суседзяў і сваякоў з вёскі і з Беластока. З далёкага Кракава меў прыехаць сын з жонкай і дзецьмі, але нявестка ўзяла яшчэ ў госці да свёкраў сваю сястру. Тая сястра ў сваю чаргу запрасіла хлопца, з якім сябравала, а той хлопец да ўсяго гэтага прывёз яшчэ свайго найлепшага калегу. Прыехалі, такім чынам, цэлай вясёлай кампаніяй.

Ну, што ж, падумалася мне, цікавяцца людзі, як святкуюць „рускія" святы. Не, дальбог, не прыйшло мне нават у галаву, што з'явіліся тут такім натоўпам, каб, як кажуць некаторыя, нажэрціся. Але ўміналі рэгіянальныя стравы роўна — не глядзі, што з гістарычнай сталіцы прыбылі. Гарадской жа ежы тут не было, а ўсё ім смакавала. Гаспадары, людзі гасцінныя, запрашалі да яды і піцця як умелі. Шчыра цешыліся, што людзі ехалі да іх такую дарогу — трыма цягнікамі з перасадкамі. Гэта ж і перад суседзямі які гонар! А хата вялікая — было дзе і палажыць тых далейшых гасцей.

І так мы ўсе выпівалі і закусвалі. У тутэйшых людзей галовы моцныя, ды і трэніруюцца яны, бадай, часцей. А вось кракаўскія няпрошаныя госцікі ўпіліся даволі хутка. Ну, бо як жа інакш можна было зразумець іх паставу, калі пачалі плявацца на „рускіх". Рабілі гэта з нейкай прадузятасцю, я б сказала, нават нянавісцю, а добра ж у той час ведалі, у каго яны ў гасцях.

Ўміналі рэгіянальныя стравы роўна — не глядзі, што з гістарычнай сталіцы прыбылі. Гарадской жа ежы тут не было, а ўсё ім смакавала. Гаспадары, людзі гасцінныя, запрашалі да яды і піцця як умелі. Шчыра цешыліся, што людзі ехалі да іх такую дарогу — трыма цягнікамі з перасадкамі. Гэта ж і перад суседзямі які гонар!..

Румяны дагэтуль твар гаспадыні спахмурнеў і пашарэў. Гаспадар аціх, апусціў вочы і не прымаў удзелу ў палітычнай дыскусіі. Што ж зрабіць — госць у дом гэта Бог у дом. Замоўклі ўрэшце і госці, гаварыў найбольш той апошні госць з ланцуга кракавян. Ён усё ведаў найлепш. Быў найразумнейшы, ледзь не пасланец ад Бога. Мо вясковым людзям сапраўды здалося, што варта яго слухаць, а мо прыціхлі з-за сваёй адвечнай скромнасці і пакоры. Гаспадар дому то быў бледны, як палатно, то рабіўся чырвоны, як рак. Відаць, у яго павышаўся ў моманты афекту ціск крыві. А раз'юшаны госць, замест гаварыць пра надвор'е і прыгожы снег за вакном, паліваў балотам іншаверцаў, „рускіх". Усе мужыкі неяк аўтаматычна перайшлі на польскую мову, па-свойму гаварылі толькі між сабой, ды і то прыцішаным голасам. Ніхто не меў адвагі ўлазіць у дыскусію з тым важным панам.

І раптам чую голас майго зяця, наогул спакойнага і ўраўнаважанага чалавека. Не вытрымаў, бедалага, і кажа: „No to może skończy pan wreszcie tę swoją tyradę?" Я не здзівілася, бо ён вельмі любіў гаспадароў гэтай хаты і не мог перанесці іх крыўды. „A cóż to pana może obchodzić?!" — здзівіўся кракус. „Bo ja też jestem ruski!" — адгыркнуўся зяць (праўду кажучы, больш паляк, чым „рускі"). Ну, і, даў жа ён яму прыкурыць!

Я ведала, што зрабіў ён гэта больш з салідарнасці, але быў гэта для мяне найбольш прыемны момант тае сустрэчы.

Ада Чачуга

АСНОВА — МОЦНЫ ПАРОЛЬ

Камп'ютэры ўсё мацней завязваюць наша жыццё — пачынаючы з мабільных тэлефонаў (упраўляе ім мікрапрацэсар), праз крэдытныя картачкі (абслугоўвае іх у рэальным часе камп'ютэрная сістэма банкаўскай сеткі), ды завяршаючы на ўласна персанальных камп'ютэрах, якія стаяць у нашых хатах ці офісах. Нехта калісьці сказаў, што камп'ютэр пачынае быць камп'ютэрам — значыць, выконваць сваю асноўную задачу, — калі ён падключаны з іншымі камп'ютэрамі ў сетку. Як ніколі раней, гэтая фраза выяўляе свой сэнс менавіта ў гэтыя першыя гады новага стагоддзя — час бурлівага росквіту сецевай інфарматычнай інфраструктуры.

Разам з гэтым росквітам наша жыццё ўсё больш залежыць ад кодаў доступу ды пароляў, праз якія заходзім у інфармацыйныя сервісы ды паслугі. Непамерна павальней аднак фармуецца наша свядомасць бяспекі ў карыстанні гэтымі даброццямі інфарматыкі. Гэты артыкул у намеры мае быць уступам да серыі парадаў на тэму як сябе паводзіць і што рабіць, каб нашы падарожжы па Інтэрнэце (гэтай камп'ютэрнай сетцы сетак) былі бяспечнымі, каб засцерагчы наш хатні камп'ютэр ад пранікнення ў яго непажаданых гасцей...

Самай папулярнай паслугай з'яўляецца электронная пошта. Колькасць эмэйлаў перавысіла колькасць лістоў адпраўленых па традыцыйнай пошце ўжо ў 90-х гадах мінулага стагоддзя. Кожны хто зрабіў сабе электронную паштовую скрынку, апынуўся перад праблемай выбару пароля. Ён павінен быць няпростым для разгадкі. Калі вы сабе зараз падумалі або сказалі ўголас, што дзеля гэтага можна скарыстаць, прыкладна, нумар пашпарта, то мне застаецца вас павіншаваць. Павіншаваць з... непапраўным аптымізмам. Чалавек, які возьмецца вас *апрацоўваць*, ведае ўсе „павярхоўныя" даныя пра вас — дату нараджэння, нумары вашага аўто, нумар пашпарта, адрас, імя жонкі, дзяцей, імёны жанчын, якія вам падабаліся ў маладосці... Не пытайце, адкуль у яго гэтыя даныя, паверце аднак, што справы маюцца менавіта так. Адно чаго ён не ведае пра вас — гэта ваш жыццёвы досвед. Ён не перажыў за вас вашага жыцця, не прачытаў вашых кніжак, не захапляўся вашымі ўлюбёнымі вершамі, яму невядомыя вашы погляды на тую ці іншую справы... Матываў для пабудовы моцнага пароля шукайце менавіта ў сусвеце свайго ўнутранага досведу, сусвеце, які недаступны ні „цывільнаму" гакеру, ні штатнаму афіцэру спецслужбаў.

Кожны пароль раней ці пазней падаецца метадам жорсткай апрацоўкі (англ.: brute-force attack). Справа аднак у тым, каб знеахвоціць вашага „апрацоўшчыка". І таму, прыкладна, 4-значны пін-код крэдытнай картачкі, які зусім добры для карыстання банкаматам (пасля трэцяй няўдалай спробы банкамат не выдасць картачку — імавернасць гакерскага поспеху тут 0,0003), цалкам не падыходзіць для пароля ў сецевых паслугах. Ён дае ўсяго „жалюгодныя" дзесяць тысяч магчымасцяў, якія сучасны камп'ютэр прабяжыць у секунду-дзве (у горшым выпадку). Нам патрэбны сама менш мільярды мільярдаў магчымасцяў. Моцны пароль — гэта незакароткая і „бессэнсоўная" паслядоўнасць сімвалаў, але прытым, хацелася б, каб бязглуздзіца лёгка запаміналася. Дык заглыбімся ў свет унутранага досведу. Хто з беларусаў не ведае фразу „Мой родны кут, як ты мне мілы! Забыць цябе не маю сілы!" Возьмем і запішам лацінкай першыя літары: mrkjtmmzcnms. 12 сімвалаў — вельмі добра. Крышку заблытаем, пішучы тое-сёе вялікімі: MrkjtmmZcnms. Цяпер, калі ласка, звярніце ўвагу, што літара „Z" у нейкім сэнсе нагадвае цыфру „2", „s" — „5", а „m" — гэта перакуленая на бок „3". Падставім гэтыя „падабенствы": Mrkjt332cn35. Вось і атрымалася 12-значная бессэнсоўная паслядоўнасць сімвалаў, якую лёгка спамятаць. І апошняя заўвага — гэта быў толькі прыклад, **дэманстрацыя**, якім чынам можна пабудаваць моцны пароль. **Вы НЕ ПАВІННЫ атрыманы тутака код скарыстоўваць у якасці вашых рэальных пароляў**. Правядзем яшчэ на заканчэнне хуткі аналіз моцы такога коду. Скарыстаны ў ім вялікія лацінскія літары (26 сімвалаў), малыя (тыя ж 26) ды лічбы (10 сімвалаў) — усяго „азбука пароля" налічвае 62 сімвалы. На кожнай з 12-ці пазіцый можа стаяць любы гэты сімвал, што дае 62 x 62 x ... x 62 = 62^{12} магчымых пароляў. Лічба гэтая немалая, але звыкламу з дзесяццю пальцамі чалавеку цяжка ўявіць колькі гэта будзе, калі 12 разоў умножыць на сябе 62. Раскрыем тады калькулятар, перавядзем яго ў навуковы рэжым ды скарыстаем функцыю дэцымальнага лагарыфма. Можна зразу ж узвесці 62 у 12 ступень, але тут цікава не сама лічба, а яе парадак. Дык вылічым, што log 62 = 1,79... Гэта значыць, што $10^{1,79}$ = 62, падставім гэта ў нашую лічбу: $62^{12} = (10^{1,79})^{12} = 10^{21,5}$. Вось і моц (парадак) — адзінка з сама менш дваццаццю адным нулём пасля яе, значыць мільярд мільярдаў умножаны яшчэ на тысячу. А гэтага было і трэба. Здольнасць хутка прыдумваць (імправізаваць) такія „несэнсоўнасці", якія лёгкія для памяці, цяжка недацаніць — вы гэта скарыстаеце не толькі як ключ да вашага паштовага сервера, але і як забеспячэнне адміністратарскага профілю root на камп'ютэры ці серверы з сістэмай Лінукс. У апошнім выпадку моцны пароль асабліва важная справа. І гэта далёка-далёка не ўсе выпадкі, калі гэткія бязглуздзіцы неабходныя...

Аляксандр Максімюк

Вялікае беспрацоўе ў нашым рэгіёне давяло да сітуацыі, што амаль кожны з нас мае сярод сваіх сямейнікаў ці знаёмых асоб, якія шукаюць працу. Каб неяк памагчы такім людзям, вядзем рубрыку „Дапамагаем з «Нівай»". Побач бясплатна будзем змяшчаць аб'явы людзей, якія шукаюць працу або могуць даць працу. Сардэчна запрашаем усіх чытачоў дасылаць у рэдакцыю свае прапановы. Рубрыку вядзе Паўліна Шафран-Асташэвіч, з якой можна кантактавацца па мабільніку нумар 0600 635 425 (або ў рэдакцыі па панядзелках ад 10 да 12 — тэл. 743 50 22).

ДАМ ПРАЦУ

• Гандлёваму прадстаўніку з вопытам, вышэйшай эканамічнай адукацыяй, без дрэнных схільнасцей, з вадзіцельскімі правамі, на тэрыторыі Падляшскага ваяводства, тэл. 0 506 798 283.

• Дам працу маладой цырульніцы (мужчынска-жаночай), тэл. 0 604 180 677.

• Маладым, моцным абітурыентам, студэнтам у аптовым складзе, тэл. 740 61 24.

ШУКАЮ ПРАЦУ

• Мужчына шукае працу ў Беластоку, аператыўны, добрае веданне рускай мовы, абслуга камп'ютэра, тэл. 0 608 210 435.

• Жанчына без дрэнных схільнасцей заапякуецца старэйшай асобай, тэл. 662 68 68.

• Студэнтка маркетынгу шукае працу ў Беластоку або ў Бельску-Падляшскім, вадзіцельскія правы кат. В, добрае веданне англійскай і рускай моў, абслуга камп'ютэра (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0 602 769 109.

• Аператыўны мужчына шукае працу ў Бельску, падставовае веданне нямецкай і рускай моў, абслуга камп'ютэра, правы кат. В, тэл. 0 608 210 435.

• Студэнтка ахвотна заапякуецца малым дзіцём у Беластоку, тэл. 744 52 93.

• Студэнтка за невялікай аплатай выконвае пераклады з рускай мовы, тэл. 0 601 421 871.

• Малады мужчына, аператыўны, шукае працу ў Беластоку, свая машына, вадзіцельскія правы кат. В, добрае веданне рускай і беларускай моў, абслуга камп'ютэра, шмат вольнага часу (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0 606 431 022.

• Маладая жанчына, шукае працу ў Беластоку, двухгадовы стаж працы ў магазіне, добрае веданне рускай і англійскай моў, абслуга камп'ютэра (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0 692 687 442.

• Малады інфарматык, 26 гадоў, працавіты і сумленны, правы кат. В, добрае веданне англійскай мовы, тэл. 0 888 899 877.

• Студэнтка шукае працу ў Беластоку, правы кат. В, веданне рускай і англійскай моў, шмат часу і ахвоты да працы, у тым ліку дапамога ў хатніх работах, тэл. 662 70 36.

• Маладая жанчына, з вопытам у апецы над дзяцьмі, шукае працу ў Беластоку, тэл. 0 609 990 085.

• Жанчына, 46 гадоў, без дрэнных схільнасцей, спакойная, заапякуецца дзіцём або старэйшай асобай, тэл. 0 692 619 609.

• Студэнт шукае працу ў Беластоку, свая машына, вадзіцельскія правы кат. В, добрае веданне рускай мовы, абслуга камп'ютэра (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0 603 431 445.

• Механік з вопытам пільна шукае працу ў Бельску, тэл. 0 692 438 475.

• Абітурыентка маркетынгу шукае працу ў Беластоку, абслуга камп'ютэра, санітарны мінімум, кніжка здароўя (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0 608 885 261.

• Студэнтка заапякуецца старэйшай асобай, тэл. 0 602 322 407.

• Абітурыентка рускай філалогіі шукае працу ў Беластоку, правы кат. В, добрае веданне англійскай мовы, закончаныя камп'ютэрныя курсы (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 732 60 27.

Дапамагаем сабе ўзаемна

У Бельску: 730 20 06

• Сям'я патрабуе адзення для дзяўчат ва ўзросце 10, 12 і 13 гадоў.

• Сям'я, якая выхоўвае трое дзяцей, патрабуе штаноў і лёгкіх блузак для хлопцаў ва ўзросце 10 і 13 гадоў, ботаў і адзення для 5-гадовай дзяўчынкі.

• Сям'я патрабуе помачы ў выглядзе яды і гігіенічных сродкаў.

• Сям'я будзе ўдзячная за ўсякую дапамогу (адзенне, пасцель, старая мэбля).

У Беластоку: 732 01 86, 712 11 53

• Сям'я патрабуе старой мэблі, халадзільніка, пасцелі.

• Сям'я патрабуе пледаў, адзення для дзяцей ва ўзросце ад 5 да 13 гадоў.

• Сям'я просіць дапамогі ў выглядзе дзіцячага адзення, пасцелі і яды.

• Сям'я, якая выхоўвае шасцёра дзяцей, патрабуе пасцелі, старой меблі, адзення.

• Тры сям'і з Відава, што каля Бельска-Падляшскага, з ахвотай аддадуць зімовыя курткі, мужчынскія і жаночыя штаны, світэры, ды іншае нязнішчанае адзенне, тэл. 730 40 00.

• Аддам дзіцячае адзенне ў добрым стане, тэл. 745 44 84.

Сабрала Паўліна Шафран-Асташэвіч

Абвесткі

*Агратурыстычная гаспадарка „Купала" ў Парыеве, 139 каля Арэшкава (Гайнаўскі павет) **запрашае ў апошнюю суботу ліпеня на Купалле.** У праграме: выступленне фальклорнага калектыву, сямейныя спаборніцтвы вудзільшчыкаў (ва ўзнагароду кубкі і дыпломы), спаборніцтвы ў кіданні кавальскімі абцугамі, а таксама народнае гулянне да белага рання.*

За дэталёвай інфармацыяй можна звяртацца па тэлефоне (085) 873-31-79. **(яц)**

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1 053 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2004 r. upływa 5 września 2004 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

„Даўціпы”

Андрэя Гаўрылюка

— Чым займаецца дэпутат? — пытае малы Янка бацьку.

— Гэта такі чалавек, які ўхваляе законы, якім пасля стараецца падпарадкоўвацца адно толькі ў час парламенцкіх перапынкаў.

* * *

— Ці гэта праўда, — распытвае журналіст дэпутата, — што ў час сустрэчы з выбаршчыкамі абкідалі вас яйкамі?

— Праўда, але былі таксама і апладысменты.

— Калі пацэльвалі?..

* * *

Двух сябраў начуюць пад палаткай. Апоўначы Янка будзіць Андрэя:

— Андрэй, што бачыш?

— Зоркі і месяц.

— Што, паводле цябе, гэта абазначае?

— Што заўтра будзе пагода.

— Асталоп ты: гэта абазначае, што нам палатку ўкралі!

* * *

— Якая розніца між жанатым і халасцяком?

— Калі халасцяк закахаецца, тады жэніцца, а калі закахаецца жанаты, тады разводзіцца.

* * *

— Не магу зразумець, чаму мужчына можа мець толькі адну жонку...

— Калі ажэнішся, тады ўцяміш, што такім чынам закон ахоўвае мужчын.

* * *

— Апасаюся, — прызнаецца жонка мужу, — што наш сын будзе ў жыцці дапускацца тых самых памылак, што і ты...

— Кінь гэта: учора ён мне заявіў, што няма ў яго ахвоты жаніцца.

* * *

— Чаму ты так нервуешся?

— Трывожуся за свой новенькі „Мерседэс”...

— А што з ім здарылася?

— Яшчэ нічога, але за яго руль садзіцца мая жонка.

* * *

Гутараць дзве сяброўкі:

— Гэта неверагодна, як твае дзеці падобныя на твайго мужа.

— Я і сама гэтаму дзівуюся.

Афарызмы Ладзіка Майніча

Рэчаіснасьць

Людзі звыклі не глядзець у зубы даранаму каню, нават калі ён Траянскі.

Яблык спакусы, яблык разладу... Высякуць яблыню з райскага саду.

З выступу адваката: „Падсудны акуратна націснуў на курок, але незнарок”.

Мэта апраўдвае сродкі. Забілі паэта — цяпер сьвяткуюць угодкі.

„Кот сказаў «гаў-гаў» — якое ноўхаў!” — шапталіся мышы.

Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталіся пот і кроў.

І пакуль мы ад веку спалі, нас палкоўнікі замяталі.

Алкаголікам часта няма за што выпіць, незалежным людзям — з кім.

Калі няма з кім выпіць — гэта адзінота, калі няма з кім напіцца — першая стадыя алкагалізму, калі ніхто не патрэбны — алкагалізм

Дэсэрт прыдумалі для таго, каб людзі ведалі, калі пара разыходзіцца.

Францішак Багушэвіч сказаў „кепска будзе”, але не сказаў, што настолькі.

Фота home.ulis.by

Слава Корань святкуе 30 гадавіну рок-творчасці

Музычныя навіны

Сёлета рок-групе „Уліс” споўніцца 15 гадоў. Таксама лідэр гурту Слава Корань святкуе 30 гадавіну рок-творчасці. Гэтыя падзеі стануць нагодай для вялікага сольнага канцэрта „Уліса” ў кастрычніку. Мабыць, у ім возьмуць удзел былыя ўдзельнікі каманды. Слава Корань кажа, што перамовы на гэты конт з экс-улісаўцамі яшчэ не вяліся. Ранейшы вакаліст „Уліса” Андрэй Патрэй, голас якога гучыць у песнях з легендарных альбомаў „Чужаніца”, „Краіна доўгай белай хмары”, жыве пад Воршай. Некалькі гадоў таму яго адшукаў журналіст „Радыё Свабода” Зміцер Бартосік у мястэчку Барань. Былая рок-зорка сталася праваслаўным вернікам. Наконт вяртання на сцэну Патрэй адказаў, што такое мажліва „если Господу будет угодно и жив буду”. Дзе цяпер Алег Тумашоў (спяваў у альбоме „Танцы на даху”) — невядома. „Апошні раз ён мне тэлефанаваў з год таму”, — кажа Корань.

Тымчасам „БМА-group” занялася падрыхтоўкай CD-бокс-сэта з легендарнымі альбомамі гурту (першыя альбомы існуюць у касетным і „элпэшным” варыянтах). У выданне ўвойдуць поўныя версіі альбомаў „Чужаніца”, „Краіна доўгай белай хмары” і „Танцы на даху” з рарытэтнымі трэкамі „Мы прыйдзем сюды”, „Лунай, пан Руст”, „Цягнік на Нясьвіж”, таксама вядзецца пошук песні „Будапешт, Прага, Кабул”. „БМА-group” звяртаецца да прыхільнікаў групы з заклікам дапамагчы ў пошуках канцэртных запісаў, відэа- і аўдыёматэрыялаў „Уліса”.

20 ліпеня **Зміцеру Вайцюшкевічу**, вядомаму ў Польшчы як Тодар, споўніцца 33 гадавіна з дня нараджэння. Якраз у гэты дзень адбудзецца вялікі ягоны канцэрт. У праграме самыя лепшыя гіты Тодара (як не глядзець, гэта амаль усе ягоныя песні — Т. С.) і новы матэрыял, які складае альбом гітоў на словы Рыгора Барадуліна. На канцэрце напэўна будуць прысутнічаць вядомыя беларускія музыкі. Як гавораць, прыйдуць, каб жадаць Зміцеру „Многае лета”.

Татка Стэп

Адгаданка

Мой родны кут

(анаграмная шарада)

Мая родна зямелька! Ты, маўляў, здароўе —
Цябе той узвялічыць, каго варагоўе
*Пагнала **Ў** свет далёкі **БЫЦЬ НА** чужым хлебе,*
*Каго **ШЧАКА** сырэе з тугі па родным небе.*

(ш)

З літар патоўшчаных слоў скласці рашэнне з першымі літарамі і іх лікам у паасобных адгадваемых словах: **Б-12**.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 23 нумара

Чаромха, Шэкспір, каравай, Дрывяты, бяспека, працэнт, моладзь.

Рашэнне: **Чэрвень**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Барыславу Рудкоўскаму** з Бельска-Падляшскага.

18.07 – 24.07

Баран (21.03. — 19.04.) Абмяжуй давер да свае інтуіцыі. Кепска ацэньваючы сітуацыю, можаш памыліцца і пасля саромецца за памылку. Ці не думаеш памяняць адрас? У сяброўстве шчыльнейшыя сувязі, але не дазволь іншым узлазіць на галаву.

Бык (20.04. — 20.05.) Не прымай хуткіх рашэнняў і не дайся падвесці ілюзіям. 19.07. — 21.07. можаш трапіць у кабалу і страціць давер асяроддзя. 24.07. будзь асцярожны з новапазнанымі людзьмі.

Блізняты (21.05. — 21.06.) 18.07. — 19.07. можаш аформіць усё. 23.07. — 25.07. — не слухай нічыіх парад; калі атачэнне цябе да чагосьці падмовіць, можаш сабе моцна намяшаць у жыцці.

Рак (22.06. — 22.07.) Важныя і неблагія здарэнні, пазітыўныя змены. Шмат энергіі, аптымізму, упэўненасці. Да 22.07. маеш ад Сонца добры настрой і вітальную энергію.

Леў (23.07. — 22.08.) Можаш мець радасць ад кампанейскіх сустрэч, але ахвотна зашыешся ў глушы. З 22.07. адчуеш, што зможаш больш, чым іншыя. Ільвы з 30.07. — 3.08. — у любоўных гульнях захавайце асаблівую развагу.

Дзева (23.08. — 22.09.) Дзевы народжаныя паміж 5 і 12.09. — усе вашы дзеянні будуць паспяховыя. Пад рукою — такі поспех, аб якім раней маглі вы толькі падумаць. Самотная Дзева не павінна ангажавацца. Дзевы з 19.09. — 22.09. — не пачынайце ніякіх спраў звязаных з кар'ерай, бо замест прыбытку можа быць страта. Дзевы з 31.08. — 3.09. — не фарсіруйце здароўя.

Шалі (23.09. — 23.10.) Падабаешся. З 19.07. па 22.07. маеш асабліва лёгкую руку выдаваць грошы. Пасля 22.07. цяжка будзе табе апанаваць зайздрасць і ахвоту маніпуляваць іншымі. Глыбокае знаёмства з 23.07. — 27.07. вельмі цяжка будзе закончыць (пазбягай даклярацый і вялікіх слоў).

Скарпіён (24.10. — 21.11.) Да 19.07. — добры час падзейнічаць і паказаць сябе з інтэлектуальнага боку. Пасля 23.07. будзеш зайздросны і нават крыху агрэсіўны. Пары ў крызісе 23.07. — 27.07. могуць расстацца; будзе балюча.

Стралец (22.11. — 21.12.) 18.07. — 22.07. шмат нервовасці. Стральцы-ласухі мусяць кантраляваць сваю вагу, бо могуць асабліва лёгка паправіцца. Таксама асцярожна з алкаголем.

Казярог (22.12. — 20.01.) Гарачае лета ў пачуццях! Меркурый спрыяе выездам; адарвіся ад штодзённых спраў. Самотны Казярог павінен урэшце забыцца, што ён — нясмелы і „смяртэльна сур'ёзны”.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Да 19.07. — рамантычны ўздым. 23.07. — 27.07. — можаш падпісаць вельмі карысную дамову ды аформіць любыя справы. Неспадзяваны канфлікт з жанчынай (23.07. — 27.07.) на некалькі дзён выб'е цябе з каляін і папсуе настрой.

Рыбы 20.02. — 20.03.) Да 19.07. — асабліва глыбокая сувязь з партнёрам. Пільнуйся, каб не згубіць ключы, дакументы, акуляры, каляндарык. Добра высыпайся.

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960